ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 16 (1653) | Пятніца, 23 лютага 1962 года. | Цана 4 кап.

РАЗМОВА АБ ТЭАТРЫ
ВЕРШЫ
П. Прыходзькі
і Я. Крупенькі

У ГЭТЫМ НУМАРЫ

ЭСТАФЕТА ПРЫГОЖЫХ СПРАЎ
ОПЕРА «ПАВЕЛ КАРЧАГІН» — ПА РАДЫЁ
УРЫВАК З АПОВЕСЦІ І. Клаза
УЛАДЗІСЛАЎ БРАНЕЎСКІ
НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ.

СТАІЦЬ НА ВАРЦЕ САЛДАТ

СТАІЦЬ НА ВАРЦЕ салдат. Салдат Краіны Саветаў.

Мільёны людзей будуюць гарады, вырошчваюць ураджаі, вынаходзяць станкі і машыны, здабываюць вугаль і метал, пішуць кнігі і карціны, а салдат стаіць на варце. На варце працы і спакою гэтых будаўнікоў, хлебаробаў, вынаходцаў, шахцёраў, сталяраў, мастакоў.

Мы часта гаворым: наш салдат выстаяў у грамадзянскую, перамог у Айчынную... Мы добра ведаем, што не тыя дваццацігадовыя хлопцы, малайцаватасцю і чаканным крокам якіх мы любуемся на першамайскіх і кастрычніцкіх парадах, абаранялі рэвалюцыйны Піцер і прыйшлі ў сорак пятым у Берлін. Але мы ахвотна пашыраем і на іх дзедаву і бацькаву славу. Бо верым, бо ўпэўнены, што ў сэрцах сённяшніх пехаціцаў і ракетчыкаў — тая ж мужнасць і адданасць Радзіме і партыі, што калісьці вялі праз смуродны Сіваш напаўразутых байцоў Фрунзе, што праз чэрць стагоддзя праявіліся ў нечуваных бітвах на Волзе і Курскай дузе. Адсюль наша братняя любоў да салдата, наша ўдзячнасць яму і гонар.

А многія з нас успамінаюць і сябе ў армейскіх гімнасцёрках. Успамінаюць таварышаў, што засталіся на ваенных дарогах. І на ўрачыстыя словы загада ваеннага міністра па даўняй, нявыветранай звычцы хочацца цвёрда адказаць разам з сённяшнімі воінамі: «Служым Савецкаму Саюзу!» Маладосць і гартаванне наша — армія. Надзея і друг наш — армія...

Стаіць на варце салдат. Салдат Краіны Саветаў. Такі ж — і не такі, якімі былі яго дзяды і бацькі, салдаты грамадзянскай і Айчыннай. Наўрад ці справіўся б чырвонаармеец васемнаццатагадвацатага гадоў з сучаснай найскладанейшай ваеннай тэхнікай і меў ён толькі лютую нянавісць да мінулага і гарачую веру ў будучыню. Замест роспісу ставіў, здаралася, крыжык, і чалавека, што скончыў царкоўна-прыходскае вучылішча, з зайздрасцю лічыў грамацеем.

Як жа далёка пайшоў уперад салдат сённяшняга дня! Салдат, узброены грунтоўнымі сучаснымі тэхнічнымі ведамі. Салдат, для якога кніжка — такая ж патрэба ў жыцці, як хлеб. Салдат, які добра ўсведамляе, што разам з усім народам змагаецца за перамогу велічных ідэалаў, сфармуляваных у Камуністычным маніфесце сучаснасці — Праграме КПСС.

І калі паспрабаваць уявіць сабе на вока сённяшняга салдата, дык ён уяўляецца ў абліччы Гагарына і Цітова, у абліччы слаўнай чацвёркі, якую не змог адолець акіян, у абліччы мужных мінёраў — герояў курскага «рэха вайны». Грамадзянскую яны ведаюць з кніжак і кінафільмаў. У Айчынную ім было па дзесяць-дванаццаць год. Але ці можна лепш падхапіць з рук дзядоў і бацькоў выдатную эстафету гераізму! Падхапіць і яшчэ раз — у мірныя дні — паказаць уражанаму свету, што такое савецкі салдат!

Мы ўрачыста адзначаем Дзень Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Мы горача абдымаем сёння салдат-ветэранаў і салдат, якія толькі што сталі ў строй. Мы славім з усім народам салдацкую вернасць прысязе, салдацкую мужнасць і адданасць, салдацкую дружбу і любоў. Разам з салдатамі мы спяваем сёння іх любімыя песні. Як добра вядомы нам словы гэтых песень. Мы памятаем іх з дзяцінства, калі з раскрытымі ад захаплення ратамі прыстройваліся ў хвост салдацкай калоны. Мы самі зачыналі іх калісьці на маршы, у зямлянцы, у казарме.

Але чакайце — ці так гэта ўжо добра, што сыны і малодшыя браты нашы — салдаты апошніх прызываў — спяваюць тыя самыя песні, што і старэйшым помняцца з дзяцінства? Вядома, добрай песні жыць і жыць. Толькі ці правільна, што амаль не чуем мы разам з даўнімі салдацкімі песнямі — новых, сённяшніх і па духу, і па зместу свайму? Ці ж не дакор гэта нам, працаўнікам літаратуры і мастацтва — кампазітарам, паэтам, музыкантам? Не пішам мы песень пра салдат і для салдат, якімі захапляемся і ганарымся. А калі пішам, дык такія, што не спяваюцца, не западаюць у сэрца.

І ці толькі пра песні гэта можна сказаць? Беларускіх пісьменнікаў нельга абвінаваціць у няўважлівасці, абыякавасці да воінскай тэмы. Героіка Айчыннай вайны, подзвігі савецкіх салдат і партызан натхнялі і натхняюць празаікаў, паэтаў, драматургаў. Штогод публікуюцца творы, якія з'яўляюцца каштоўным укладам у мастацкі летапіс усенароднай мужнасці ў час Вялікай Айчыннай вайны. Але зноў-такі: сённяшнія армейскія будні, вобраз сённяшняга салдата — дзе яны ў беларускай літаратуры?

Кожны год немалая група пісьменнікаў па некалькі месяцаў знаходзіцца ў творчых камандзіроўках, у воінскіх часцях і на караблях Ваенна-Марскога Флоту. А ці вялікія вынікі гэтага? Чаму не з'яўляюцца і ў нас такія грунтоўныя творы аб сённяшняй арміі і флоце, як, напрыклад, раман Г. Бярозкі «Мірны атам» ці п'еса А. Штэйна «Акіян» — творы, што з'явіліся ў братняй рускай літаратуры.

Тое самае ў беларускім ваяўленчым мастацтве. Брэсцкая крэпасць... Колькі мастакоў прысвяціла свае карціны яе легендарнай абароне. І гэта — высакародная, удзячная тэма. Але ж не менш удзячная тэма — сённяшнія абаронцы нашых рубяжоў, сыны герояў Брэста.

А беларускі тэатр? Дзе спектаклі, якія маглі б стаць тэмай гарачых дыспутаў у асяроддзі воінаў? Дзе спектаклі, якія працягвалі б размову, пачатую калісьці пастаўленымі на беларускай сцэне «Пробай агнём», «Хлопцам з нашага горада», «Фронтам», «Брэсцкай крэпасцю»?..

Стаіць на варце салдат.
Салдат Краіны Саветаў.

Салдат, якога ад шчырага сэрца віншуем мы сёння са святам.

Салдат, што стане — абавязкова стане! — масавым героем нашай песні, кнігі, карціны.

Пятро ПРЫХОДЗЬКА

ВІШНЁВЫ АГОНЬ

Фрагменты, якія друкуюцца ніжэй, узяты з паэмы «Вішнёвы агонь», задуманай увесну мінулага года, калі я быў на Украіне. Праз семнаццаць год давялося прайсці па валынскай зямлі, дзе ўдзельнічаў у баях. Адбыліся новыя незабыўныя сустрэчы. Вельмі хацелася хоць у нейкай меры перадаць пачуцці, якія жылі і жывуць у маім сэрцы і ў сэрцах сяброў.

Аўтар.

Бялеюць хаты ў дальніх вёсках,
Квітнеюць яблыні наўкруг.
І ціха падаюць пялёсткі
Як лебядзіны мяккі пух.

Дарога сцелецца раўнінай,
Нібы размотаны клубок.
Ля кожнай белае хаціны
Гарыць вішнёвы аганёк.

Уся зямля, як сад зялёны,
Жыццём абуджаны ад сну.
Ідуць на поўнач эшалоны,
З сабой прыносячы вясну.

Адтуль прывозяць самазвалы,
Назад вязуць нам вугаль, сталь.
Ад працы аж пацеюць шпалы,
Груз несучы цяжкі у даль.

Зямля Валыні! Па табе я
Не раз тужыў усёй душой.
Ты праз вішнёвую завею
Вяла мяне ў рашучы бой.

. . . . . .

Я зноў к тваім вярнуўся нетрам,
Садам, што з цемры вызваляў.
І ты мяне цалуеш ветрам,
Умываеш чыстым срэбрам траў.

. . . . . .

Іду ад Роўна праз даліну
Былой дарогай франтавой.
Салодкі сок п'е рой пчаліны,
Дзе вішні сталі ў роўны строй.

. . . . . .

Было мне суджана, салдату,
Тут, ідучы з сябрамі ў бой,
Пад белай вішняю ля хаты
Спаткаць дзяўчыну раніцой.

Была б сустрэча мо звычайнай,
Забыўся б хутка я аб ёй,
Калі б не позірк з нейкай тайнай
І шчырай-шчырай цеплынёй.

Быў я ад дыму ўвесь счарнелы,
Ссыпаўся з плеч акопны жвір.
А прада мной — твар белы, белы
І вочы чорныя, як вір.

Мне не забыць вачэй тых чорных:
Бы зоры ўспыхнулі ў начах —
І ўся краса Валыні зорнай
У тых адбілася вачах.

. . . . . .

Не, я не зваў яе каханай —
На гэта права я не меў.
Адзін, адзін жа толькі ранак
Мінуў, як я яе сустрэў.

Я гаварыў з ёй гэтак мала.
Струменіў голас той ракой,
Як на парозе мне сказала:
«Жадаю шчасця, голуб мой!»

«Жадаю шчасця!» — адказалі
Сады, умытыя расой.
Пялёсткі белыя апалі
Ад гулу з вішні маладой.

. . . . . .

Мне мілай стала вёска Радуў
І сад, дзе вішні адцвілі.
Ужо ўявіў — іду з брыгадай
Араць калгасныя палі.

Акоп заворваю той самы,
У якім сяджу.
Яна — са мной.
Яе зямля з яе садамі
Мне стала роднаю зямлёй.

І домік той, і вішня тая,
Што пад акном яе цвіла.
І не хачу я знаць, якая
Далей наперадзе зямля.

«Ты не спяшайся», — кажа сэрца,
І трэба смутак свой суняць.
Яшчэ паспееш наглядзецца,
Яшчэ паспееш пакахаць.

Табе ісці праз горы, рэкі,
Яшчэ капаць акопаў шмат.
Не аднаго ж ты чалавека
Павінен вызваліць, салдат.

. . . . . .

Прайшлі гады. А ён не гасне
Нідзе, агонь вішнёвы той.
Дзе б я ні быў, ён зоркай яснай
Заўжды гарыць перада мной.

. . . . . .

Шмат год — шчаслівых і
суровых —
Прайшло над нашаю зямлёй.
А я ўсё помню тыя словы:
«Жадаю шчасця, голуб мой!»

Радзіма! Нашы ёй жаданні,
Парывы светлыя душы.
Яна вучыла нас каханням,
Як лепшай песняй, даражыць.

З табою будзем сустракацца
Заўжды — у радасці й бядзе.
Мо нашы дзеці парадняцца;
Хай свеціць дзецям светлы дзень.

Агеньчык дружбы нашай недзе
Успыхне новаю вясной,
Калі твой сын у Мінск прыедзе,
З маёй сустрэнецца дачкой.

Хай даспявае больш на полі
Для іх калоссяў залатых,
І не паўторыцца ніколі
Расстанне нашае для іх.

З'ЕЗД ПРАФСАЮЗАЎ БЕЛАРУСІ

На працягу двух дзён у Мінску працаваў X з'езд прафсаюзаў Беларусі. З усіх куткоў рэспублікі прыехалі прадстаўнікі заводаў, фабрык, будоўляў, дзяржаўных устаноў. Сярод іх — наватары вытворчасці, работнікі культуры, дзеячы навукі, мастацтва.

Удзельнікі з'езда абмеркавалі справаздачны даклад старшыні Рэспубліканскага савета прафсаюзаў І. М. Макарава аб рабоце Беларускага рэспубліканскага савета прафсаюзаў.

Выступаўшыя адзначылі, што перыяд паміж IX і X з'ездамі характарызуецца новымі буйнымі поспехамі ў развіцці народнай гаспадаркі Беларусі. Прафсаюзы рэспублікі з'явіліся ініцыятарамі сацыялістычнага спаборніцтва за выкананне планаў сямігодкі, распаўсюджанне і ўкараненне перадавога вопыту, правялі значную работу па павышэнню культурна-тэхнічнага ўзроўню працоўных. Вялікае месца ў выхаванні рабочых і служачых прафсаюзы адводзяць культурным установам. У цяперашні час у веданні прафсаюзаў ёсць 432 клубы і Палацы культуры, каля 5.000 чырвоных куткоў, больш чым 1.000 бібліятэк з кніжным фондам 3,5 мільёна тамоў кніг.

З'езд па абмеркаванаму пытанню прыняў рашэнне. З вялікім уздымам дэлегаты паслалі прывітанне Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

З'езд выбраў новы склад Рэспубліканскага савета прафсаюзаў. Адбыўся пленум савета, які разгледзеў арганізацыйныя пытанні.

Старшынёй Рэспубліканскага савета прафсаюзаў выбран І. М. Макараў, сакратарамі А. П. Абуховіч і М. Л. Дубкова.

Дэлегаты X з'езда прафсаюзаў Беларусі (справа налева) Герой Сацыялістычнай працы А. Віташкевіч — расточнік Мінскага завода аўтаматычных ліній, З. Гарбовіч і Н. Панкратава — перадавікі магілёўскіх прадпрыемстваў.

Фота Ул. КРУКА.

А ЯКІ Ж ЁН СТАНОЎЧЫ?..

Р. БЯРОЗКІН

Працягваем размову аб тэатральным мастацтве. Пра станоўчага героя, пра яго мастацкае ўвасабленне ў беларускіх п'есах выказвае свае думкі Р. Бярозкін.

Наступнае слова — крытыку В. Каваленку.

У НАШАЙ КРЫТЫЦЫ шырока бытуе і стала звычайнай думка аб тым, што адмоўныя героі ўдаюцца беларускім драматургам значна лепш за герояў станоўчых. Гэтую думку сцвярджае, у прыватнасці, і Алесь Звонак, аўтар артыкула «Пагаворым шчыра», якім пачалася дыскусія па пытаннях сучаснага беларускага тэатра.

Цалкам згаджаючыся з пунктам погляду А. Звонака, я хацеў бы падкрэсліць яшчэ адну і надзвычай важную, як мне здаецца, акалічнасць, звязаную з праблемай станоўчага характару.

Справа ў тым, што нашы драматургі часта выдаюць за **станоўчы** характар такога героя, які пры бліжэйшым разглядзе аказваецца ідэйна нязначным і жыццёва збедненым альбо проста мала цікавым і сумным.

Вось якраз пра два характэрныя ў гэтым сэнсе выпадкі, калі драматургі яўна памыліліся ў сваіх поглядах на героя, мне і хочацца пагаварыць. «Маральна-этычны» напрамак гэтых заметак выкліканы тым, што і п'есы, пра якія пойдзе гаворка, маюць сваёй асновай маральна-этычную праблематыку.

1.

...Галю Яснікаву, перадавую даярку, добрую і прыгожую дзяўчыну, напаткала гора: яе разлюбіў муж, дырэктар школы, біёлаг Леанід Андрэевіч Яснікаў. Нават не разлюбіў, а здрадзіў Галі, ашукаў яе — людзі бачылі, як ён у лесе, за рэчкаю, цалаваўся з гарадской мяшчанкай, з «блудніцай». Галя пакутуе, і ў адной сцэне (асабліва гэта падкрэслена ў спектаклі Тэатра імя Я. Коласа), узрушаная нявернасцю Леаніда, яна просіць парады ў таварышаў па працы, у гледачоў у зале і нават у кніг на стале і паліцах.

Уявім сабе фантастычнае: кнігі загаварылі. Што б яны адказалі ашуканай Галі? Яны б, напэўна, сказалі вось што:

— Тое, што адбылося паміж табой і гэтым... як яго... Леанідам Андрэевічам, датычыць вас дваіх. Сустрэньцеся, пагаварыце, высветліце свае адносіны. І не вельмі слухайся тых, хто са скуры вылузваецца, каб любой цаной захаваць «мір у хаце», уяўнасць і форму «добрапрыстойнай сям'і». Яны больш клапоцяцца аб сваёй рэпутацыі маралістаў і зусім не пра тое, каб табе было па-сапраўднаму хораша...

Так альбо прыкладна так адказалі б Галі кнігі, напісаныя гуманістамі, людзьмі, якія вышэй за ўсё ставілі шчасце чалавека, яго высокую годнасць, — і, напэўна, Галя б аднеслася да іх з недаверам, бо аўтары гэтых кніг мелі далёкае ўяўленне аб сіле і чуласці свабоднага калектыву. І тады варта было б Галі раскрыць яшчэ адну кнігу, мудрэйшую за многія іншыя, і на яе старонках яна прычытала б такія радкі пра сябе, пра людзей сацыялістычнага грамадства, пра іх узаемаадносіны ў сферы сям'і і кахання:

«Калі з'явяцца такія людзі... Яны самі створаць сваю грамадскую практыку і адпаведную ёй грамадскую думку аб учынках кожнага паасобку».

Гэта — Энгельс, «Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы».

На першы і павярхоўны погляд можа здацца, быццам Энгельс сцвярджае анархісцкае сваволле ў маральных паводзінах, іх абсалютную незалежнасць ад грамадскага суда. Але наўрад ці гэта так. У сапраўднасці Энгельс хоча, як нам здаецца, падкрэсліць, што кожны прадстаўнік сацыялістычнага грамадства будзе ў сэрцы сваім несці прынцыпы яго, што гэтыя прынцыпы зробяцца чалавечай **натурай**. І хіба не працягам гэтай энгельсавай думкі гучыць такі тэзіс з новай Праграмы КПСС:

«У працэсе пераходу да камунізма ўсё больш узрастае роля маральных асноў у жыцці грамадства, расшыраецца сфера дзеяння маральнага фактару і адпаведна змяншаецца значэнне адміністрацыйнага рэгулявання ўзаемаадносін паміж людзьмі».

Нельга сказаць, каб гераіні шамякінскай п'есы былі ўжо так па душы ўсялякія «адміністрацыйныя рэгуліроўшчыкі» ў галіне маралі, каб яна асабліва ветліва і ахвотна сустракала кожнага, хто наважыўся ёй «дапамагчы» там, дзе вырашальнае слова належыць ёй самой — яе чысціні, сумленню і годнасці. «Хто цябе прасіў лезці ў чужое жыццё?» — гаворыць яна аднаму з такіх «сяброў». І гаворыць зусім слушна.

Здавалася б, ясна. Здавалася б, пісьменнік павінен быў зразумець, што яго задача — мастацка аналізаваць узаемаадносіны, якія склаліся паміж героямі, знайсці грамадскі, сацыяльны «нерв» гэтых узаемаадносін і вывесці з іх тыя ўрокі, якія б садзейнічалі росту і фарміраванню новага чалавека. Але зрабіць гэтага пісьменнік, на жаль, не здолеў, і не здолеў таму, што ў п'есе адсутнічае прадмет і матэрыял аналізу: той чалавечы змест, які б мог хаця б у вачах саміх герояў служыць матывам і апраўданнем іх уласных учынкаў. Адсутнасць сур'ёзнага ўнутранага зместу ў п'есе кампенсуе «знешняя сіла» — тыповы рэзанёр, гэтакі не ў меру энергічны штурхач-рэгуліроўшчык, які пад выглядам актыўнага ўмяшання ў жыццё толькі і робіць, што ставіць усё дагары нагамі і ператварае ў тлумнае відовішча, у базар галіну самых тонкіх, самых індывідуальных па характару чалавечых узаемаадносін... Прозвішча гэтага рэгуліроўшчыка — Гаворка. Васіль Раманавіч Гаворка. Па прафесіі ён паэт...

Думаецца, што фігуры падобныя да Гаворкі, даюць магчымасць абмеркаваць даволі шырокую і вельмі надзённую тэму аб духоўнай культуры сучаснага героя, аб яго чалавечым абліччы, аб ступені яго ўнутранай **інтэлігентнасці**, ужо без тых іранічных двукоссяў, у якія нярэдка бралася гэтае паняцце раней.

Прынятая на XXII з'ездзе Праграма КПСС адкрыла новыя гарызонты перад нашай літаратурай. Сёння мы патрабуем ад пісьменнікаў, каб яны паказалі такога героя, які самааддана робіць сваю справу з глыбокай вынашанай патрэбы прынесці шчасце людзям, з патрэбы стаць **другам, таварышам, братам** кожнаму — далёкаму і блізкаму — удзельніку будаўніцтва новага камуністычнага свету. Аднак дрэнна будзе, — а такія сімптомы ўжо ёсць, — калі на змену герою, які далей сваёй сённяшняй практычнай задачы нічога не бачыць, прыйдзе «лірык», не акрылены ўнутранай глыбокай радасцю яднання з людзьмі, а толькі са жмутам саманавейшых, як яму здаецца, «указанняў па лініі чуласці».

Нядаўна я прачытаў аповесць аднаго рускага пісьменніка. У ёй ёсць такая сцэна: да кіраўніка буйнога прадпрыемства прыходзіць наймацца на працу стары франтавы таварыш. У часе размовы дырэктар дазнаецца, што яго друг — халасцяк. Божа, што сталася з дырэктарамі Катэгарычна, тонам, які не церпіць ніякіх пярэчанняў, ён адмаўляецца прыняць таварыша на прадпрыемства, таму што пераважная большасць рабочых — маладыя жанчыны, дзяўчаты... Якая недарэчная, дзіўная логіка! І не ведаеш, чаго ў ёй больш: беспадстаўнай, па сутнасці, падазронасці да франтавога друга альбо абразлівага недаверу да калектыву работніц. Але ж паспрабуйце сказаць аўтару, што ўсе разважанні і дзеянні яго героя грубыя, дурныя і ніякага дачынення да камуністычнай этыкі не маюць. Не паверыць. Нават запратэстуе: ён жа нацэльвае таварыша на стварэнне сям'і!..

Іменна горкі вопыт знаёмства вось з такімі дырэктарамі прымушае нас, сутыкнуўшыся з тым ці іншым літаратурным героем, ставіць перад ім пытанне: а што ты за чалавек? Ці ўмееш ты адчуць радасць і гора другога чалавека і павесці сябе такім чынам, каб не зняважыць чужой годнасці і захаваць сваю?

Давайце запытаемся: «што ты за чалавек?» — І ў героя шамякінскай п'есы — у Васіля Гаворкі.

Некаторыя крытыкі, якія пісалі пра «Выгнанне блудніцы», адказалі на гэта пытанне вельмі станоўча: «ён увасабляе чалавечнасць нашага сённяшняга жыцця», «цэласны, пераканаўчы і вельмі прывабны характар мастака нашых дзён», пазіцыя яго «грамадска актыўная, наступальная» і г. д. і г. д.

Рызыкуючы наклікаць на сябе грэх густаўшчыны (згодзімся, што і вышэй цытаваныя крытыкі таксама зыходзілі са свайго ўласнага густу), скажу, што мне, прынамсі, уяўляецца Гаворка чалавекам малапрывабным — самаўлюбёным, недастаткова чулым, пазбаўленым абаяльнасці ці таго, што ў штодзённым побыце называюць сімпатычнасцю.

Пачнём хаця б з таго, як Гаворка размаўляе з людзьмі. Калі Гаворка, паказваючы на белае, гаворыць «чорнае», дык не таму, што ён так бачыць, — ён проста хоча пераканацца, што вы, яго субяседнік, не блытаеце фарбы і колеры.

Вось у размове з Галяй паэт выкладае свае погляды на сям'ю: «Нават у бібліі, Галя, сказана: «Жена да будет рабой своего мужа...» Вы насцяражыліся: няўжо ён так думае? Але хутка вы пачынаеце разумець, што «думка» Гаворкі — не сапраўднае яго пераконанне, што яна — толькі манеўр, штосьці накшталт пасткі для Галі: пападзецца ці не? І калі Галя дазваляе сабе не згадзіцца з гаворкавай «філасофіяй сям'і», ён дае ёй ацэнку з вышыні сваёй вялікадушнасці: «Брава! Ты мяне б'еш, Галя... У цябе цвёрдыя ідэі».

І нават ведаючы ўжо гэту недарэчную звычку паэта палохаць ні ў чым не вінаватых людзей «супярэчлівасцю» свайго мыслення, вы ўсё-такі слупянееце, учуўшы, як ён пачынае маляваць перад той жа Галяй ідылію, вартую самага дробнакалібернага кар'ерыста: «Лёс любіць тых, хто з зоркамі... Вось уяві — з'яўляюцца ў палац гэтага свяцілішча навукі новы акадэмік — Герой, і жонка яго — Гераіня» і г. д.

Дзеля чаго ён так выкручваецца, гэты Гаворка? Зноў жа дзеля таго, каб, выслухаўшы пярэчанні дзяўчыны, адразу ж рэтыравацца і ператварыць размову ў нікчэмны спектакль: «Ты сур'ёзна пакрыўдзілася? Ну-у... Я жартаваў».

А колькі ў гэтым Гаворку ненатуральнасці, пыхі, смешнаватай прыхільнасці да самаўніжэння! Вось адна сцэна, характэрная для стылю гаворкавых паводзін:

«Галя. Васіль Раманавіч! Маша закахана ў вас.

(Заканчэнне на 2-й і 3-й стар.)

ЭСТАФЕТА ПРЫГОЖЫХ СПРАЎ

Народныя кніжныя магазіны! Гэтая новая форма гандлю кнігай нарадзілася нядаўна. Магазіны працуюць там, дзе камсамольцы і моладзь любяць кнігу, з'яўляюцца яе вернымі і надзейнымі сябрамі. Маладыя энтузіясты збіраюць заяўкі на літаратуру ў цэхах свайго прадпрыемства, самі прывозяць кнігі і распаўсюджваюць іх.

Пра вопыт работы народных кніжных магазінаў, якія працуюць у Гомелі на фабрыцы «Праца» і на заводзе імя Кірава, расказвае гэты артыкул.

КНІГА прыходзіць у цэх

Марыэта Яркіна і Аляксандра Бухтарэвіч раней не былі нават знаёмы. Жывуць яны ў розных канцах горада, працуюць на розных прадпрыемствах (адна з іх інжынер-канструктар завода імя Кірава, другая — работнік аддзела тэхнічнага кантролю фабрыкі «Праца»). Але актыўны ўдзел у грамадскай рабоце зблізіў іх, і камсамолкі пасябравалі.

Аднойчы сакратар Цэнтральнага райкома камсамола Гомеля прапанаваў актывістам узяць шэфства над кнігай, памагчы яе распаўсюджваць непасрэдна на прадпрыемстве, ва ўстановах і на будоўлях горада.

— Гэтага нам яшчэ не хапала,— гаварыў высокі хлопец-будаўнік.— Кніжныя магазіны планы не выконваюць, а нам павінна гапава балець. Няхай вучацца працаваць у рабочага класа. Хіба мала ў нас сваіх спраў на вытворчасці? І план трэба выконваць, і завочна вучыцца. На танцы і ў кіно маладому таксама не пашкодзіць схадзіць. Бачыце самі — сутак не хапае на ўсе справы.

— Глядзіце, дзяўчаткі, заплача небарака. Дайце яму насоўку слёзы гаручыя збіраць,— адказала на гэта заўжды вясёлая і жартаўлівая Шура Бухтарэвіч.

Усе засмяяліся, і адразу стала неяк весялей.

На гэты раз пэўнага рашэння не прымалі, абышлося без надакучлівых «абавязацьь», «зрабіць», «далажыць». Сакратар на развітанне прапанаваў падумаць, як лепш арганізаваць гэтую новую для ўсіх справу, параіцца ў сваіх калектывах.

Прадстаўнік кнігагандлю пакідаў пасяджэнне незадаволеным. Так нічога канкрэтнага і не вырашылі камсамольцы. Толькі дарэмна спадзяваліся на іх.

Тым часам Марыэта і Шура выйшлі на залітую яркімі электрычнымі агнямі Камсамольскую вуліцу. Пайшлі трошкі пагуляць, паслухаць вясёлы гоман вячэрняга горада. Непрыкметна зачалася гаворка пра тое, што зрабіць, каб кожны рабочы іх прадпрыемства абавязкова набываў для сваёй бібліятэчкі кнігі.

— Думаю, што ў нас на фабрыцы за прапаганду кнігі горача возьмецца Вера Касцянкова, — дзялілася сваімі думкамі з сяброўкай Бухтарэвіч. — Яна — брыгадзір брыгады камуністычнай працы, завочна вучыцца ў Маскоўскім тэхналагічным інстытуце. І абедзве Валі — Салаўёва і Максіменка — нашы першыя работніцы, таксама любяць кнігу. Вось з іх, відаць, трэба і пачынаць.

Праз невялікі час на фабрыцы «Праца» быў створан савет сяброў кнігі. У яго ўвайшлі Вера Касцянкова, Валя Салаўёва, Валя Максіменка, Марыя Мельнічэнка і многія іншыя.

На станкабудаўнічым заводзе імя Кірава стварылі ініцыятыўную групу камсамольцаў, якой даручылі распаўсюджваць кнігі. Ад кожнага цэха былі свае прадстаўнікі. Слесар Міхаіл Праскоўскі— ад зборачнага цэха, кранаўшчыца Наталля Літвіненка — ад ліцейнага, Тамара Каралькова — ад другога механічнага цэха. Марыэта Яркіна ўзяла шэфства над канструктарскім і тэхналагічным бюро і заводакіраўніцтвам. На чатку восем камсамольцаў пагадзіліся распаўсюджваць кнігу ў цэхах свайго завода. Але паставілі адну ўмову: па літаратуру яны не будуць хадзіць у магазін, няхай кнігагандаль дастаўляе яе на завод.

Пайшла Марыэта ў магазін № 5. Яе там ветліва сустрэлі, далі магчымасць выбіраць любую літаратуру, а вось у транспарце адмовілі. Давялося самой насіць цяжкія пакункі кніг на завод. Крыўдна было. «Не для сябе ж стараюся, — іншы раз думала яна, несучы на завод заказаную літаратуру. — А прынясеш кнігі, і пакласці няма дзе». Цяжка вельмі было.

Так узнікла думка пабудаваць на тэрыторыі завода спецыяльную кнігарню. Марыэта бачыла на здымках некалькі праектаў народных кніжных магазінаў, створаных ленінградцамі. Камсамолка пайшла са сваёй прапановай ў партком і дырэкцыю завода. Яе падтрымалі. Пабудуем, толькі праект дай, сказалі ёй.

Некалькі вечароў сядзела М. Яркіна, разам з інжынерам Крывашэіным распрацоўваючы праект. Задумалі кніжны магазін, па форме вельмі падобны да разгорнутай кнігі, светлы, амаль увесь са шкла.

Рабочым завода спадабалася прапанова камсамольцаў. Яны ўзяліся будаваць павільён для кніг на грамадскіх асновах.

Тым часам распаўсюджвальнікі кніг настойліва і паслядоўна вялі сваю работу. У кожным цэху былі ўжо выяўлены кнігалюбы. У спецыяльны сшытак запісвалі яны заяўкі на літаратуру. А іх з кожным днём было ўсё больш і больш. Тэхніку-канструктару, завочніку політэхнічнага інстытута Аляксандру Грамыку патрэбна было многа спецыяльнай літаратуры, і камсамольцы дасталі яму многія кнігі. Тэхнік Юрый Макараў захапляецца літаратурай па мастацтву. Ён ахвотна набыў кнігі Шаляпіна, Рэпіна, альбомы аб Трацькоўскай галерэі, Эрмітажы і інш. Канструктар Віктар Усачонак цікавіцца тэхнічнай і гістарычнай літаратурай. Яму прыносілі многа гістарычных раманаў. Вялікім кнігалюбам аказаўся і Аляксандр Павалоцкі. Ён не толькі ахвотна набываў кнігі для сваёй хатняй бібліятэкі, але сам памагаў камсамольцам распаўсюджваць літаратуру.

З кожным днём пашыралася дзейнасць камсамольцаў-энтузіястаў. Ужо адна М. Яркіна не спраўлялася дастаўляць літаратуру на завод. Вырашылі, каб кожны ўпаўнаважаны па цэху сам ішоў у магазін і падбіраў патрэбныя яму кнігі. У гэты час і ў аблкнігагандлі ўбачылі, што камсамольцы слоў на вецер не кідаюць. І раз у дэкаду цяпер ім даюць машыну, на якой завозяць літаратуру на завод. Каб лепш разыходзілася кніга, выкарыстоўвалі маладзёжныя вечары і іншыя масавыя мерапрыемствы. У заўкоме і ў камітэце камсамола дамовіліся, што ў латарэях галоўнымі выйгрышамі будуць кнігі. І пераможцам на шахматных турнірах уручаліся таксама кнігі.

А на фабрыцы «Праца» арганізавалі продаж кніг у крэдыт. Робяць гэта такім чынам: на століках у цэхах ляжаць кнігі. І не заўсёды ля іх стаіць прадавец-камсамолец. Часцей за ўсё яго няма. Работніца выбірае сабе кнігу і запісвае ў сшытак, што яна ўзяла, а таксама і кошт кнігі. У дні зарплаты грошы поўнасцю ўносяцца ў «касу». А каса — гэта невялічкая скрыначка, у якую работніцы самі кладуць грошы. Так выплачваецца запазычанасць. Яшчэ не было выпадку, каб хто-небудзь у калектыве падвёў сваіх жа таварышаў.

У Гомелі праводзіліся кніжныя кірмашы. І кожны раз самы актыўны ўдзел у іх прымалі кнігалюбы фабрыкі «Праца», завода імя Кірава.

У ліпені 1961 года адкрылі народны кніжны магазін. Гэты дзень на заводзе імя Кірава стаў сапраўдным святам кнігі. Гандаль ішоў даволі бойка. За дзень выручка склала каля 40 рублёў. Магазін працаваў у час абедзенных перапынкаў на заводзе — з 11 да 2 гадзін дня.

Вырашылі, што працаваць ён будзе тры разы на тыдзень. Праўда, зімою ў ім холадна, і камсамольцы зноў перанеслі сваю работу ў цэхі завода, бліжэй да пакупніка.

Радавалася поспехам кіраўцаў Шура Бухтарэвіч. Расказала яна ў парткоме і дырэкцыі фабрыкі, якую добрую справу зрабілі станкабудаўнікі. Прапанову Бухтарэвіч падтрымалі. І вось у дзень адкрыцця XXII з'езда КПСС і на фабрыцы «Праца» быў адкрыты народны кніжны магазін, пабудаваны па праекту кіраўцаў. Абутнікі яшчэ радыёфікавалі цэхі сваёй фабрыкі. Гэта вельмі памагло камсамольцам-кнігалюбам. Атрымаеш новую літаратуру і адразу паведаміш па радыё, якія кнігі ёсць у народным магазіне.

Работай народнага магазіна на фабрыцы «Праца» ўмела кіруе брыгадзір брыгады камуністычнай працы Вера Касцянкова, а на заводзе імя Кірава — капіроўшчыца Тамара Кастраміна.

Летась камсамольцы-кіраўцы прадалі амаль на 1 600 рублёў рознай літаратуры. І няма на прадпрыемстве такога рабочага, які б не купіў сабе кнігу ў заводскім народным кніжным магазіне. Камсамольцы прадалі каля 3 200 кніг. Сярод іх 300 экземпляраў палітычнай літаратуры, звыш 200 твораў беларускіх пісьменнікаў і 579 экземпляраў беларускай дзіцячай літаратуры, 866 экземпляраў падручнікаў для завочнікаў і тэхнічнай літаратуры, звыш 1 000 экземпляраў мастацкай літаратуры. Рабочыя набывалі творы Я. Коласа, Я. Купалы, І. Шамякіна, І. Мележа, раман А. Адамовіча «Вайна пад стрэхамі» і многія іншыя кнігі беларускіх пісьменнікаў.

На фабрыцы «Праца» летась было распаўсюджана рознай літаратуры на 1 300 рублёў.

Ёсць у М. Яркінай і А. Бухтарэвіч, якія цяпер працуюць сакратарамі камсамольскіх камітэтаў на сваіх прадпрыемствах, нямала прапаноў, як лепш наладзіць работу народных кніжных магазінаў, ёсць і прэтэнзіі да Гомельскага аблкнігагандлю. Вельмі патрэбна народным кніжным магазінам спецыяльная тэхнічная літаратура па электроніцы, канструкцыі станкоў, тэхналогіі пашыву абутку, аб машынах і абсталяванні для прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці і інш. Але такой літаратуры і днём з агнём не знойдзеш у Гомелі. Хіба гэтыя кнігі не выдаюцца ў нашай краіне? Яны, вядома, ёсць, але аблкнігагандаль не заказвае іх.

— І яшчэ хочацца, — гаворыць М. Яркіна, — большай самастойнасці. Пакуль што нашы народныя кніжныя магазіны ўсяго толькі дадатак да магазіна № 5, у якім мы бяром літаратуру. Фактычна, мы памагаем яму выконваць план. А нам бы хацелася самастойна афармляць заказы на літаратуру, атрымліваць яе, як усе магазіны, з базы.

Гэтая наша залежнасць адчувальна на кожным кроку. Праводзіць, напрыклад, магазін падпіску на шматтомныя выданні. Звычайна народны кніжны магазін атрымлівае дазвол пачынаць падпіску значна пазней. А чаму? У нас жа няма ніякай канкурэнцыі. Мы робім адну агульную справу. Проста нашым рабочым зручней аформіць падпіску на сваім прадпрыемстве і не губляць на гэта цэлы працоўны дзень. Гэтак жа было, калі праводзілася падпіска на творы Ільфа і Пятрова. І колькі мы ні хадзілі да дырэктара аблкнігагандлю тав. Вяршэні, ён ўсё роўна не даў нам лімітаў, каб аформіць падпіску на нашым прадпрыемстве. Тое ж самае здарылася і з падпіскай на творы Фейхтвангера.

— Толькі ў Мінску я даведалася, — расказвае Шура Бухтарэвіч, што ў мінулым годзе праводзілася падпіска на творы Коласа і Купалы. Гэта гаворыць аб тым, што рэклама ў кніжным гандлі наладжана надзвычай дрэнна. Ну, а пра народныя магазіны наогул мала дбаюць у аблкнігагандлі.

— І яшчэ нам вельмі хацелася б, — гаворыць у заключэнне Марыэта Яркіна, — каб у наш народны кніжны магазін прыехалі беларускія пісьменнікі. Такія сустрэчы нам вельмі патрэбны.

За год работы народныя кніжныя магазіны набылі пэўны вопыт і ўменне працаваць з кнігай. У Гомелі працуюць ужо чатыры такія магазіны. Добрыя вынікі ў працы народных кніжных магазінаў на фабрыцы «Камінтэрн» і на заводзе трактарных пускавых рухавікоў.

Актыўна працуюць грамадскія распаўсюджвальнікі кнігі на прадпрыемствах Гомеля. Яны робяць вялікую і карысную справу — памагаюць партыі несці ў масы святло культуры і ведаў. І трэба чула ставіцца да патрэб энтузіястаў культурнага фронту. Будучыня — за народнымі кніжнымі магазінамі. Яны — піянеры вялікай справы. Вопыт іх заслугоўвае самага шырокага пераймання.

Я. ДАНСКАЯ.

Вось яны, дзве сяброўкі: інжынер-канструктар станкабудаўнічага завода імя Кірава Марыэта Яркіна (справа) і кантралёр АТК абутковай фабрыкі «Праца» Аляксандра Бухтарэвіч. Цікава пры сустрэчы абмяняцца вопытам сваёй работы...

Фота Ул. Крука.

МУЗЫЧНАЯ РАДЫЁПРЭМ'ЕРА

У сваёй творчасці беларускія кампазітары даволі часта звяртаюцца да складанага оперна-балетнага жанра. За няпоўныя трыццаць год было напісана каля дваццаці беларускіх опер і балетаў. Па-рознаму склаўся іх лёс: некаторыя з гэтых твораў прагучалі толькі ў канцэртным выкананні, другія (іх большасць) у свой час былі пастаўлены на сцэне Беларускага тэатра оперы і балета, трэція тэатру не спадабаліся і так і не ўбачылі святла рампы.

Беларускае радыё праводзіць значную работу па прапагандзе опернай творчасці беларускіх кампазітараў. У яго фанатэцы ёсць поўныя магнітафонныя запісы, спецыяльныя мантажы, урыўкі амаль усіх беларускіх балетных і оперных твораў, што нярэдка гучаць у эфіры.

Нядаўна Беларускае радыё пазнаёміла слухачоў з запісам урыўкаў з оперы «Павел Карчагін» беларускага кампазітара П. Падкавырава. У эфіры прагучала 14 музычных нумароў оперы: арыі большасці галоўных дзеючых асоб, некаторыя сцэны, частка аркестравых нумароў і амаль поўнасцю ўся сёмая карціна «У клініцы». Гэта дае падставу не толькі ўсяляк вітаць прапагандысцкую дзейнасць рэспубліканскага музычнага вяшчання і яго новую прэм'еру, але і крыху падрабязней спыніцца на якасцях оперы.

Мы не памылімся, калі скажам, што ў творчасці П. Падкавырава пераважае камсамольская тэматыка. З першых крокаў сваёй дзейнасці кампазітар лепшыя творы прысвячае камсамолу (Першая сімфонія, рад песень, рамансаў, інструментальных твораў). Не дзіўна, што першую сваю оперу П. Падкавыраў напісаў на сюжэт рамана М. Астроўскага «Як гартавалася сталь».

Гісторыя стварэння гэтай оперы мае амаль 25-гадовы «стаж». Першы яе варыянт кампазітар пачаў пісаць яшчэ ў 1937 годзе, а ў красавіку 1941 года яна была закончана ў клавіры і прынята да пастаноўкі Беларускім тэатрам оперы і балета. Але Айчынная вайна перашкодзіла паставіць оперны твор, клавір загінуў, і праз некалькі год кампазітар распачаў працу над операй нанава.

Вось чаму, калі слухаеш новыя запісы «Паўла Карчагіна», адразу звяртаеш увагу на своеасаблівую «прадуманасць» музыкі. Напэўна, ад гэтага ідзе і лаканічнасць музыкі і іменна дзякуючы гэтаму яна падкупляе шчырасцю, цеплынёй, пачуццём маладосці. Музычная мова оперы вылучаецца даступнасцю, шырокай напеўнасцю, рытмічнай разнастайнасцю. Разам з тым кампазітар не палохаецца складаных гарманічных спалучэнняў, вострых гармоній і нечаканых інтанацыйных абаротаў. А гэта ўжо сведчыць аб сучасным характары музыкі. Праслуханыя нумары і знаёмства з партытурай даюць падставы меркаваць, што опера пабудавана на прынцыпах сімфанічнага развіцця.

Оперныя спевакі нярэдка дакараюць сучасных кампазітараў у тым, што іх оперы «не спяваюцца». Музыка ж «Паўла Карчагіна» вылучаецца якраз тым, што кожнаму з персанажаў «ёсць што праспяваць». У оперы нямала месц, у якіх надзвычай поўна і ўдала выкарыстоўваецца фактура асобных галасоў, і спеваку, як кажуць, ёсць дзе сябе паказаць. Да такіх нумароў можна аднесці «Песню Тоні» з першай дзеі, напісаную для каларатурнага сапрана, тэнаровую арыю Жаркага з чацвёртай карціны і рад іншых. Запамінаюцца сваёй цеплынёй і шчырасцю «Уступ» і «Песня разведчыкаў» з чацвёртай карціны, у якіх раскрываюцца вобразы роднай прыроды і характары людзей. З сапраўдным драматызмам, але разам з тым светла і натхнёна гучыць «Песня Хрысціны» (другая дзея). Трэба адзначыць добрыя музычныя якасці арыі Жухрая з шостай карціны, арыі Паўла, арыёза Прафесара, сцэны і маналогі Паўла з сёмай карціны. Але, напэўна, самага большага эмацыянальнага напружання дасягае апошняе арыёза Паўла і фінал восьмай карціны оперы.

Калі музыка оперы П. Падкавырава, якая трансліравалася па радыё, успрымаецца, то гэтага нельга сказаць пра літаратурны тэкст. У даваенным варыянце лібрэта былі значныя хібы: слабая драматургія, вялікая колькасць дзеючых асоб, расцягнутасць. Новы варыянт оперы кампазітар напісаў на ўласнае лібрэта.

Узяўшыся за гэтую нялёгкую справу, П. Падкавыраў здолеў выбраць найбольш удалыя мясціны з рамана М. Астроўскага і стварыць драматургічную аснову оперы больш кароткай і імклівай па дзеянню. Але мова лібрэта атрымалася вельмі слабай. Усюды, дзе кампазітар, беручы празаічны тэкст рамана, сам перакладае яго на вершы, а потым ужо на музыку, заўважаем страшэнныя моўныя памылкі, якія непрыемна рэжуць вуха. У большасці выпадкаў П. Падкавыраў карыстаецца дзеяслоўнымі рыфмамі і нярэдка ў пошуках іх наогул няправільна будуе сказы, скажае асобныя словы. Для прыкладу можна прывесці некалькі радкоў арыёза Маці з пятай карціны оперы:

«Гляжу я на тебя: характером
ты вдался в деда.
Он плавал в моряках и был
ужасный непоседа.
Настоящий разбойник, прости
господи!
С войны пришел калекой,
а груди в медалях — отменный.
Да, что в наградах царских?
Жил в бедности всегда
страшенной...»

«Моўныя агрэхі» ў тэксце новай оперы зніжаюць яе мастацкую каштоўнасць. Вядома, цяжка прапанаваць перарабіць нанава ўсё лібрэта, але над яго тэкстам павінеч добра папрацаваць хто-небудзь з нашых паэтаў — лібрэтыстаў і песеннікаў. Тады толькі можна будзе гаварыць аб пастаноўцы оперы ў тэатры.

Над прэм'ерай оперы для радыё працаваў цэлы калектыў. Гэта — салісты Беларускага радыё і тэлебачання В. Прышчапёнак (Павел), В. Фурс (Маці), М. Марозава (Хрысціна), К. Ясінская (Тоня), Ю. Смірноў (Іван Жаркі), народны артыст рэспублікі М. Дзянісаў (Жухрай), Д. Марозаў (Прафесар). Усе яны паставіліся да работы над новым творам сур'ёзна, шчыра і з пачуццём вялікай адказнасці. Падрыхтаваць да выканання вакальныя нумары вельмі дапамагла канцэртмайстар Беларускага радыё Т. Мінсарава.

Пахвалы заслугоўвае і работа музычнага кіраўніка, дырыжора Б. Райскага. Акрамя чыста «пастановачнай» работы, яму прыйшлося вырашыць і рад іншых праблем. Аркестр Беларускага радыё па свайму складу не падрыхтаваны да запісаў вялікіх сімфанічных і оперных твораў. Таму прыйшлося на некаторыя інструменты браць дадатковых выканаўцаў, значна пашырыць струнную групу, часам «на ходу» пераараскестроўваць тое ці іншае месца партытуры, правесці вялізарную рэпетыцыйную работу з аркестрам і салістамі. Вынікам такой працы з'явілася добрае і чыстае гучанне аркестра, пачуццё ансамбля з салістамі і добрыя па прафесіянальных якасцях музычныя запісы.

Д. ЖУРАЎЛЁЎ.

НА ТЭЛЕЭКРАНЕ— ПЕРАМОЖЦЫ КОНКУРСУ

Мінская студыя тэлебачання наладзіла канцэрт пераможцаў рэспубліканскага конкурсу маладых выканаўцаў — удзельнікаў мастацкай самадзейнасці. Перад тэлегледачамі выступілі спевакі, чытальнікі, інструменталісты, узнагароджаныя дыпломамі і Ганаровымі граматамі.

Арыі з опер, песні савецкіх кампазітараў, рамансы рускіх і заходнееўрапейскіх аўтараў выканалі інжынер трэста СКБ Б. Палякоў, супрацоўніца мінскага ГУМа Р. Угоднікава, фармацэўт клінікі трактарнага завода Ю. Дзяргун, эканаміст Г. Чарнышоў, удзельнікі мастацкай самадзейнасці Палаца культуры прафсаюзаў Л. Кудзеля і В. Пакідчанка. Творы беларускіх і савецкіх аўтараў прачыталі А. Скарабагатая і І. Гарэцкі. Супрацоўнік трактарнага завода А. Калыцька выканаў некалькі твораў на балалайцы.

*

ЦІКАВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

Тэме — «Якім павінен быць чалавек камуністычнага грамадства» была прысвечана канферэнцыя чытачоў Лепельскай раённай бібліятэкі. У лекцыйнай зале раённага Дома культуры сабраліся рабочыя, служачыя, вучнёўская моладзь.

На канферэнцыі ішла вялікая размова аб маральным кодэксе будаўнікоў камунізма, аб працоўных справах калгаснікаў раёна.

Настаўнікі Э. Мазговіч і М. Занько, работніца друкарні Г. Гурко, работніца грамадскага харчавання Н. Кірухіна гаварылі аб савецкім чалавеку, стваральніку камуністычнага будучага, аб вялікай дружбе народаў нашай вялікай шматнацыянальнай Радзімы.

М. ШМАТКОЎ.

БЕЛАРУСКІЯ АРТЫСТЫ Ў ЛЕНІНГРАДЗЕ

Праўленне Ленінградскага аддзялення Усерасійскага тэатральнага аб'яднання і савет Палаца работнікаў мастацтва імя Станіслаўскага наладзілі днямі творчую сустрэчу майстроў мастацтва Беларусі з майстрамі мастацтва Ленінграда.

Уступным словам адкрыла сустрэчу старшыня Беларускага тэатральнага аб'яднання народная артыстка СССР Л. Александроўская.

У першым аддзяленні сустрэчы адбыўся канцэрт беларускіх артыстаў, у якім выступілі народная артыстка БССР Т. Ніжнікава, заслужаныя артысты рэспублікі В. Глушакоў, Т. Шымко, А. Карзянкова, В. Крыкава, В. Давыдаў, А. Астрамецкі, С. Талкачоў, саліст Тэатра оперы і балета Б. Нікольскі.

У другім аддзяленні быў паказаны першы акт камедыі Я. Купалы «Паўлінка» ў выкананні славутых майстроў Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Я. Купалы. У камедыі прынялі ўдзел народныя артысты Саюза ССР Г. Глебаў і Л. Ржэцкая, народныя артысты БССР В. Пола і В. Дзядзюшка, артысты В. Купрэвіч і Б. Дакальская.

А ЯКІ Ж ЁН СТАНОЎЧЫ?..

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Гаворка. Вы фантазёрка, Галя. На мяне і дзесяць год назад дзяўчаты не кідалі вокам.

Галя. А на вас і нельга глядзець проста так, як на другіх: ах, які прыгожы хлопец! Вас трэба пазнаць, душу вашу...

Гаворка. Не будзем пра душу, Галя. Гэта — містыка. У мяне няма душы... Я — бяздушны».

У другім месцы, слухаючы, як дзед Піліп спявае народную песню, Гаворка заўважае: «Ён і цяпер адчувае сапраўдную паэзію. Гэта мы чарсцвеем душою». У трэцім — прызнаецца, што ён чалавек «рахманы ці, правільней — бяззубы, як усе лірыкі». У чацвёртым — рэкамендуе сябе гультаём, які не любіць зімы, бо зімой «мімаволі прыходзіцца многа працаваць».

Не трэба думаць, што іменна так, характарызуючы сабе, як чалавека бяздушнага, гультаяватага, стомленага без пары, Гаворка выказвае праўдзівую думку аб самім сабе. Не, гэта ў яго такі спосаб паказаць сябе «цікавым». І такі ён на працягу ўсёй п'есы — з выкрутасамі, з добра разлічанай «самакрытычнасцю на дыбачках» і з той «бязлітаснасцю» ў самаацэнках, якую нехта павінен адмаўляць: ах, душа, ах, на вас нельга глядзець, як на другіх!..

Не ведаю як на каго, а на мяне робіць даволі непрыемнае ўражанне гаворкава мова: то напышліва-нежывая («калі ласка, дзіцё маё», «...украсці шчасце ў гэтай чыстай, святой душы»); то найгана-паблажлівая ў дачыненні да «простага» чалавека («Галя! Ты ж зрабіла геніяльнае адкрыццё», «гэтакае геніяльнае спалучэнне інтэлігенцкага і сялянскага быту», «о, дзяўчаты геніяльна падабралі карціны для маёй лекцыі ў Рудні»). Адкуль ідзе ў Гаворкі гэты птушыны жаргон? Ад павярхоўнасці яго культуры, ад таго, што яму неўласціва сапраўдная інтэлігентнасць, якая лёгка і натуральна адшуквае патрэбны такт у адносінах паміж людзьмі.

Надзвычай многа разважае Гаворка на тэмы кахання і сям'і. Пакінем у баку ўжо вядомую нам «думку» пра жонку — рабыню мужа. Згодзімся, што сказана гэта дзеля «гумару». Але вось ён, Гаворка, разважае ўжо як быццам сур'ёзна: «Мне трэба ажаніцца. Каб ціхая, добрая жонка сядзела побач і глядзела на мяне». І раней, назіраючы, як Галя завіхаецца ў хаце: «Шчаслівы чалавек, якому з такім клопатам падаграюць абед...» Што і казаць, не надта змястоўныя ідэалы сямейнага шчасця! А зрэшты, можа паэт і тут жартуе: ён жа «складаны...»

Я глыбока перакананы, што чалавек з такім узроўнем эмацыянальнага жыцця, з такой душэўнай культурай, з такім стылем паводзін зусім не падыходзіць на ролю суддзі і «арбітра» ў маральна-этычнай сферы. Але ж драматург даручыў яму падобную ролю, і праз гэта п'еса «Выгнанне блудніцы» страціла ўсё тое каштоўнае, што было ў задуме пісьменніка і што па-сапраўднаму варта паглыбленага мастацкага вырашэння.

А быў у таленавітага і цікавага раманіста пахвальны намер сцвердзіць народжаную нашым жыццём ідэю чалавечай блізкасці і чалавечага яднання, думку аб тым, што людзі ў нашым грамадстве добра разумеюць адзін аднаго і дапамагаюць адзін аднаму ў цяжкасцях, у бядзе. Пахвальны, скажам яшчэ раз, намер, высокая і гуманная думка! Аднак вырашана яна спрошчана, павярхоўна, і зноў жа таму, што праваднікам гэтай думкі стаў чалавек павярхоўны, чалавек, які не навучыўся заўважаць тое адметнае, асаблівае, што вылучае сферу інтымных чалавечых узаемаадносін сярод іншых сфер жыцця.

Гаворка разважае проста: сям'я — гэта шчасце, а разбурэнне сям'і — гора, а паколькі прычынай усялякіх сямейных неладоў з'яўляецца, як правіла, амаральны, распусны чалавек, дык трэба падняць супраць гэтага чалавека масу, мабілізаваць калектыў, і шчасце ў сям'і (адразу, сёння альбо пазней) будзе адноўлена.

У п'есе гэта выглядае так: хцівая гарадская мяшчанка Яўгенія Любаміраўна спакусіла мужа Галі Яснікавай — Леаніда Андрэевіча, чалавека сумнага, ардынарнага, чалавека, які на працягу трох актаў (нават на ўласным вяселлі) гаворыць такой мовай: «Трэба, каб быў кармавы комплекс», «але тут узнікае праблема кармоў», «прыметы малапрадукцыйных продкаў» і г. д. (Адзначу, што радаснага захаплення працай у Яснікава я не заўважыў, — я бачу толькі сумную аднастайнасць у словах і паводзінах). Дадайце сюды і больш чым дзіўную яго гатоўнасць быць «спакушаным» першым жа ўзмахам музыканцкай ручкі, і яго спалох: «Галя ведае?», і камічнае, зусім, як у Прысыпкіна (з «Клапа» Маякоўскага), імкненне да «раскошнага жыцця», — і вы зразумееце, што не такое ўжо і вялікае шчасце для Галі быць жонкай такога чалавека і што толькі «мараліст» гаворкавай праніклівасці мог не заўважыць бязрадаснасці гэтага шлюбу. Але на тое ён і «мараліст», «змагар за ўзмацненне сям'і», каб наогул не прымаць у разлік такую вырашальную акалічнасць, як узаемапавага і ўзаемадавер у сям'і, як чалавечая змястоўнасць шлюбу.

Так, па абсалютна памылковаму перакананню, быццам, ва ўсіх сямейных няшчасцях заўсёды вінаваты «трэці», пачынаецца гаворкава вайна з «блудніцай».

Яўгенія Любаміраўна — чалавек ва ўсіх адносінах адмоўны. Правільна. Нават не чалавек, а збор усіх грахоў, якія толькі можна сабе ўявіць. Колькасць і «групаванне» гэтых «грахоў» падаюцца самым адвольным змяненнем. На манекен можна надзець цыліндр і футбольныя буцы — паспрабуйце гэта зрабіць з жывым чалавекам. Але бог з ёю, з гэтай Любаміраўнай. Мяне цікавіць Гаворка і яго адносіны з гэтай жанчынай. Вось ён размаўляе з Галяй пра музыкантку:

«Галя. Ажаніліся б з Яўгеніяй Любаміраўнай. Яна — прыгожая.

Гаворка. Хэ! Уляпіла, як у сук. Гэта пераспелая смакоўніца хацела ажаніць мяне (!) з сабою яшчэ пяць год назад.

Галя. Чаму ж вы не ажаніліся?

Гаворка. Выявілася, што я разумнейшы, чым можна было чакаць ад маладога паэта. Праўда, буду шчыры: памог Горкі... Я перачытваў яго. А ты помніш, як ён піша пра мяшчанства?.. І я таксама ўзненавідзеў мяшчанства».

Ясна? У першы раз стрэўшы маладую дзяўчыну, паэт, творца чалавечага шчасця (як сам сябе называе Гаворка), убачыў у ёй не чалавека, а ілюстрацыю да Горкага, не асобу, а саслоўе. І нават не спрабуючы высветліць, кахае ці не кахае ён гэту дзяўчыну, не задумваючыся над тым, што і ён мог бы неяк садзейнічаць выхаванню Яўгеніі, адразу, з ходу, як кажуць, сказаў сабе: сацыяльна не падыходзіць, абражае маю стэрыльнасць...

А далей? А далей (праз пяць год!) Гаворка выклікае Яўгенію ў сяло на пасаду выкладчыцы музыкі — так, прынамсі, тлумачыць паэт мэту гэтага выкліку. А нам, чытачам, здаецца, што выклікаў ён Яўгенію, каб яшчэ і яшчэ раз, з самых розных прычын, прадэманстраваць сваю непрымірымасць да мяшчанства.

Усяляк «выкрываючы» Яўгенію, Гаворка паводзіць сябе пры гэтым так, што, акрамя ўсяго іншага, проста траціць свой мужчынскі гонар: «прадажная шкура», «тыгрыца», «драпежніца». І нярэдка трапляе ў даволі смешнае становішча.

Вось ён, паэт, абвінавачвае музыкантку: яна працуе толькі дзеля грошай. І паміж імі адбываецца размова:

«Яўгенія. Тыдзень назад ты абураўся, што табе не высылаюць ганарару.

Гаворка. Але. Абураўся. Атрымаў гэты ганарар — купіў вось рэпрадукцыі.

Яўгенія. Прыгожы жэст. А заўтра паляціш, каб узяць рахунак...

Гаворка. Можа, і паеду. Але не з-за прагнасці да грошай, я ніколі не складаў іх у панчоху. Тут прынцып...»

Бач які! І рэпутацыя захавана, і прынцып вытрыманы, і грошы пры ім. І не толькі грошы, а і машына, пра якую з нейкай мілай нядбайнасцю паэт успамінае ў канцы п'есы... Аднак вернемся да героя ў яго галоўнай функцыі, у функцыі «барацьбіта за маральную чысціню», бо час канчаць гэту гаворку пра Гаворку.

Перапалоханы Яснікаў просіць друга: «Слухай, Вася. Я цябе прашу аб адным: нічога не рабі... Навошта табе? Я сам пагавару з Галяй. І, можа, усё ўладжу...» Але непахісны Вася катэгарычна адхіляе просьбу друга, прыкладна так, як раней адхіліў просьбу Карнача, старшыні калгаса, не лезці ў гаспадарчыя справы. Логіка ў адным і ў другім выпадку агульная: «А мяне ўсё датычыць. Такая ў мяне прафесія». Як быццам гаспадарчыя непаладкі і канфлікт у чужой сям'і—адно і тое ж і патрабуюць знешняга ўмяшання ў аднолькавай меры і ў аднолькавых формах.

І скажу шчыра, неяк няёмка і крыўдна робіцца за людзей, калі бачыш на сцэне, як гэтыя людзі, «узнятыя» Гаворкам, ва ўсякім разе з яго маўклівай згоды, пачынаюць «выганяць блудніцу». Крыўдна і нават сорамна за дзеда Піліпа, калі ён з кіем у руках гоніцца за музыканткай і лае яе апошнімі словамі. Крыўдна за бацькоў, якія прымусілі маленькіх дзяцей, вучняў пачатковых класаў, не хадзіць на ўрокі да «цёці», што цалуецца з «чужымі мужчынамі».

Крыўдна, нарэшце, за пісьменніка з добрым талентам і добрым сэрцам, які перадаверыў сваю дабрату чалавеку абмежаванаму, нячуламу, прыхільнаму да прымітыўна-«аўральных» метадаў вырашэння этычных праблем...

Не, што б там ні гаварылася пра Гаворку, як бы пра яго ні пісалі рэцэнзенты, — цяжка назваць такога героя сучасным і перадавым!

2.

Амаль адначасова з п'есай І. Шамякіна была надрукавана і пастаўлена на сцэне Тэатра імя Я. Купалы п'еса П. Васілеўскага «Любоў, Надзея, Вера...»

Параўноўваючы гэтыя дзве драмы паміж сабой, бачыш, што гэта драмы-спрачальніцы, драмы-антыподы, і калі не ведаць, што пісаліся яны незалежна адна ад другой, дык можна было б падумаць, што П. Васілеўскі ставіў сабе свядомай мэтай абвергнуць свайго калегу. Спрэчка ідзе па ўсіх лініях — у галоўным і другарадным, нават у падрабязнасцях і дэталях.

Так, у п'есе І. Шамякіна займае значнае месца тэма эстэтычнага выхавання моладзі. Вырашаецца гэта тэма, скажам прама, не без налёту пражэкцёрства, аблегчана, у духу прыхільнікаў «сельскіх Трацькоўак»: на сценах у школе вывешаны рэпрадукцыі, усеабдымны Гаворка чытае лекцыю (дапускаючы, дарэчы, грубыя недакладнасці), і маладыя даяркі, ледзь не пляскаючы ў далоні, выказваюць сваё захапленне велічнасцю «шэдэўраў».

П. Васілеўскі падзяляе іншы, больш праўдзівы погляд на працэс эстэтычнага ўзбагачэння чалавека, ён бачыць складанасць гэтага працэсу, і ў яго малады рабочы, разважаючы

НА ШЫРОКІ ПРАСТОР

ПЛЕНУМ БЕЛАРУСКАГА ТЭАТРАЛЬНАГА ТАВАРЫСТВА

«Перад пісьменнікамі, мастакамі, музыкантамі, дзеячамі тэатра і кіно адкрываецца шырокі прастор для праяўлення асабістай творчай ініцыятывы, высокага майстэрства, разнастайнасці творчых форм, стыляў і жанраў».

Высокім даверам, павагай да чалавека творчай працы прасякнуты гэтыя словы Праграмы Камуністычнай партыі.

Як адказаць на заклік партыі? Як скарыстаць свабоду творчай ініцыятывы, каб быць вартым памочнікам партыі ў справе камуністычнага будаўніцтва?

Гэтымі пытаннямі сёння жывуць усе работнікі мастацтва. Ім і быў прысвечаны пленум Беларускага тэатральнага таварыства, які адбыўся 12—13 лютага ў г. Мінску. Даклад дэлегата XXII з'езда КПСС, міністра культуры БССР Р. Я. Кісялёва і выступленні ўдзельнікаў пленума былі прасякнуты творчым неспакоем і пачуццём вялікай грамадзянскай адказнасці.

— Камунізм не адмяняе, а відазмяняе працу. Сёння, як ніколі раней, нам патрэбны людзі, улюбёныя ў сваю справу, — сказаў дакладчык.

Любоў да справы стансвіцца неабходнай умовай кожнай прафесіі. Асабліва важна яна ў такім мастацтве, як тэатр. Тут нават адзін бяздушны рамеснік можа сваёй абыякавасцю звесці на нішто працу і намаганні цэлага калектыву.

Першае звяно ў мастацтве тэатра — драматургія. Дакладчык адзначыў пэўныя зрухі ў гэтай галіне. За мінулы год на сцэнах тэатраў рэспублікі з'явілася адзінаццаць новых п'ес беларускіх аўтараў. Сярод іх найбольшую цікавасць у грамадскасці выклікалі «Лявоніха на арбіце» А. Макаёнка (Тэатр імя Янкі Купалы), «Крыніцы» І. Шамякіна і Ю. Шчарбакова (Тэатр імя Якуба Коласа) і «На хвалях Серабранкі» (Тэатр юнага гледача). Гэтыя творы нясуць на сабе адбітак актыўнага умяшання ў жыццё. Ідэі, закладзеныя ў іх, сучасныя і надзённыя, і, што вельмі важна, яны ўспрымаюцца гледачом як лагічны мастацкі вынік з падзей, а не ў выглядзе аголенай публіцыстыкі.

Аднак спектакляў, глыбокіх па думцы, эмацыянальных па строю, у нас паяўляецца мала. Не апраўдалі спадзяванняў грамадскасці «Твой светлы шлях» А. Маўзона і «Любоў, Надзея, Вера...» П. Васілеўскага ў Тэатры імя Янкі Купалы. У п'есе А. Маўзона надуманы грамадзянскі канфлікт, а асабісты лёс герояў не хвалюе гледача. Твор П. Васілеўскага не завершаны ў мастацкіх адносінах, у ім адчуваецца супярэчлівасць вобразаў, слабае веданне драматургам жыццёвага матэрыялу. Аўтар не справіўся з задачай стварэння абагуленай філасофскай драмы.

— Бяда нашай драматургіі, — сказаў тэатразнаўца Ул. Няфёд, — не ў дробнасці тэм і праблематыкі, а ў неглыбокім вырашэнні іх.

Згадзіўшыся з крытыкай дакладчыка ў адрас драмы П. Васілеўскага, Ул. Няфёд лічыць усё ж, што яна заслугоўвае прынцыповай падтрымкі, бо аўтар тут спрабуе адысці ад стандарту, шукае складаныя шляхі да вырашэння сучаснай тэматыкі.

Прамоўца закрануў пытанне аб выхаваўчым уздзеянні тэатра на гледачоў.

Думку Ул. Няфёда аб павышэнні выхаваўчых функцый тэатра падтрымаў і развіў у сваім выступленні намеснік старшыні Усерасійскага тэатральнага таварыства Д. Дэйсмар.

Рэжысёр Л. Рахленка спыніўся на праблеме мастацкага ўвасаблення задумы. Ён спасылаўся на прыклады з гісторыі тэатра, даводзячы думку аб тым, што значнасць тэмы яшчэ нічога не вырашае, калі ў творы няма праўды жыцця, а ёсць толькі праўдападобнасць. Аднак, пераходзячы да практыкі, ён заклікаў да пастаноўкі п'ес нават з недахопамі, абы ў іх узнімаліся важныя пытанні. Такім чынам, правільныя думкі ператварыліся ў яго выступленні ў амністыю недасканалым творам. Ніхто, вядома, не можа гарантаваць тэатру ў кожнай яго новай рабоце бездакорнасць мастацкіх вынікаў. Няўдачы здараюцца. Але навошта ж абвяшчаць іх нормай жыцця тэатра?

Усхвалявана палемізаваў з Л. Рахленкам рэжысёр Б. Браганцаў (г. Віцебск). Ён заклікае драматургаў садзіцца за пісьмовы стол толькі тады, калі ёсць грамадзянская патрэба выказаць нешта сваё, новае. Прамоўца выказвае катэгарычную нязгоду з А. Звонакам, які ў пачатай на старонках газеты «Літаратура і мастацтва» размове аб тэатры патрабаваў ад калектываў дапрацоўкі недасканалых п'ес. Драматургам павінна быць сорамна прыносіць у тэатр паўфабрыкаты, — так заключыў сваю думку Б. Браганцаў.

Справы драматургіі, рэпертуару вельмі хвалююць дзеячоў беларускай сцэны. Гэта адчувалася ў кожным выступленні на пленуме. Шкада толькі, што ў зале амаль не было тых, ад каго залежыць гэтая справа, — саміх драматургаў.

Значнае месца ў дакладзе Р. Я. Кісялёва было адведзена ролі рэжысуры. Рэжысура знаходзіцца на стыку ўсіх праблем нашага тэатра, сказаў дакладчык. Спасылаючыся на артыкул Д. А. Арлова, апублікаваны ў газеце «Літаратура і мастацтва», ён падкрэсліў, што з-за адсутнасці сапраўднага арганізатара-рэжысёра пачынае траціць ансамблевасць такі таленавіты і паважаны ў рэспубліцы і краіне калектыў, як Тэатр імя Янкі Купалы. Недахоп кваліфікаваных рэжысёраў з'яўляецца сёння галоўным тормазам у развіцці ўсіх нашых тэатраў, у павышэнні агульнага ўзроўню іх культуры.

Р. Я. Кісялёў адзначае, што ў нас дрэнна выхоўваюцца рэжысёрскія кадры. На рэжысёрскім факультэце Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута вучыцца 29 чалавек (з іх пяць — на чацвёртым курсе). На іх можна ўскладаць пэўныя спадзяванні, хоць, шчыра кажучы, гэта — кропля ў моры, калі ўлічваць вялікія патрэбы нашых тэатраў — прафесіянальных, народных, самадзейных (трэба дадаць сюды і студыі тэлебачання).

— У нас аўтарытэт рэжысёра не ўзняты на належную вышыню, — сказаў у сваім выступленні рэжысёр М. Співак.

Прызнаючы, што ў нас няма рэжысёраў, якія б самастойна і смела трактавалі творы, ён ставіць у прыклад практыку Таўстаногава, Плучака, Яфрэмава, Ахлопкава.

Вядома, што ў справе фарміравання купалаўскага калектыву адыграў значную ролю Е. Міровіч. Аднак, як напомніў Л. Рахленка, Е. Міровіч пакінуў тэатр у 1930 годзе. Трыццаць адзін год пасля яго купалаўцы працуюць з іншымі рэжысёрамі. На гэтыя гады прыпадае нямала слаўных старонак у гісторыі тэатра. Што ж прывяло яго да сённяшняга цяжкага стану?

На гэтае пытанне слушна адказаў Б. Браганцаў: у майстроў не было належнага клопату аб выхаванні змены. Каго выхаваў К. Саннікаў ці той жа Л. Рахленка? Чаму яны не маюць сваіх паслядоўнікаў?

Пошукі майстроў рэжысуры за межамі рэспублікі трэба працягваць. Але, як вядома, і там становішча не лепшае: добрых рэжысёраў не хапае ў краіне. Пра гэта гаварылі госці з Украіны і РСФСР.

Дзе ж выхад?

Напэўна, у тым, каб «выяўляць Таўстаногавых сярод нас», як сказала З. Браварская. Выяўляць і выхоўваць іх — руплива, упарта і штодзённа. У гэтай справе значную ролю павінна адыграць і Беларускае тэатральнае таварыства. Пры ім існуе (пакуль што, на жаль, толькі на паперы) рэжысёрская секцыя. Першае кіраўніцтва секцыі нічым сябе не праявіла. Выбралі другое (старшыня — К. Саннікаў). Але, як сказаў галоўны рэжысёр Гомельскага тэатра Л. Эльстон, секцыя і да гэтага часу не падае аніякіх прыкмет жыцця. Да Л. Эльстона далучыўся мастак А. Свішчоў (Гомель). Ён прапанаваў, каб БТТ арганізоўвала калектыўныя паездкі рэжысёраў на пастаноўкі сваіх калег з абмеркаваннем прагледжаных спектакляў.

Прынцыповую размову аб становішчы ў Беларускім дзяржаўным тэатры оперы і балета вяла музыказнаўца А. Ладыгіна. Яе выступленне, спрэчнае ў некаторых сцвярджэннях, было прасякнута шчырым клопатам аб перспектывах і справах гэтага буйнейшага мастацкага калектыву рэспублікі. Шкада, што галоўны балетмайстар Л. Андрэеў (адзіны прамоўца ад Тэатра оперы і балета) абмежаваўся канстатацыяй нязначных недахопаў у практыцы тэатра.

Шмат увагі на пленуме было адведзена ролі артыста ў калектыўнай творчасці тэатра.

Дакладчык адзначыў, што тэатры рэспублікі багатыя на таленавітых выканаўцаў. Вялікім здабыткам нашага мастацтва ён назваў новы тып савецкага акцёра — свядомага, адукаванага, культурнага дзеяча ідэалагічнага фронту. Прыводзячы прыклады самаадданага і плённага служэння акцёраў справе тэатра, Р. Я. Кісялёў, аднак, з неспакоем і заклапочанасцю гаварыў пра тое, што агульны ўзровень выканаўчага майстэрства ў тэатрах невысокі, што нашы артысты не заўсёды з'яўляюцца сапраўднымі выхавацелямі гледачоў. Р. Я. Кісялёў прывёў факты маральнай разбэшчанасці асобных артыстаў Тэатра юнага гледача і Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.

У павышэнні культуры артыста, гаворыць дакладчык, значную ролю павінны адыграць мастацкія саветы тэатраў, якія пакуль што абмяжоўваюцца, як правіла, абмеркаваннем прэм'ер. На пашыраных пасяджэннях саветаў не ўзнімаюцца праблемныя пытанні мастацтва.

Напомніўшы выказванне М. С. Хрушчова аб тым, што «сіла партыйнасці — у калектыўным кіраўніцтве», дакладчык заклікае ўмацоўваць калектыўную думку ў тэатральным жыцці. У мастацкіх саветах, гаворыць ён, закладзена невычэрпная крыніца калектыўнасці кіраўніцтва тэатральнымі справамі.

Аб маральна-палітычным аблічча савецкага акцёра гаварылі многія прамоўцы: Ул. Стэльмах, З. Браварская, М. Співак і іншыя.

У выхаванні маладых артыстаў значную ролю адыгрывае крытыка. Яна павінна пільна сачыць за развіццём талентаў.

Закрануўшы пытанне наватарства, дакладчык з жалем адзначыў, што мала нараджаецца ў тэатрах свежых і яркіх спектакляў з арыгінальным вырашэннем. Тым больш трэба вітаць і падтрымліваць пошукі новых выяўленчых сродкаў, калі яны накіраваны на вобразнае вырашэнне ідэйнай задумы. У гэтым вялікую ролю павінна адыгрываць тэатральная крытыка. Але крытыка ў нас слабая, — адзначае дакладчык.

Гарачыя спрэчкі ўзніклі на пленуме па пытаннях творчых сувязей прафесіяналаў з народнымі тэатрамі. Рэжысёр-кансультант РДНТ С. Гурыч, дырэктар Слонімскага РДК В. Тарасевіч, дырэктар Тэатра імя ЛКСМБ Л. Валчэцкі і іншыя гаварылі аб формах творчай вучобы артыстаў народных тэатраў. Гэтыя праблемы вырашана спецыяльна абмеркаваць на сумесным пасяджэнні прэзідыума БТТ з работнікамі Рэспубліканскага дома народнай творчасці.

Пленум Тэатральнага таварыства ўзняў шэраг надзённых пытанняў. Яны занатаваны ў прынятай на пленуме рэзалюцыі. Іх вырашэнне намечана ў плане арганізацыйна-творчых мерапрыемстваў таварыства на 1962 год, абмеркаванню якога было амаль цалкам прысвечана другое пасяджэнне пленума. Зацверджаны план прадугледжвае шырокае кола мерапрыемстваў. Ён ахопліваe ўсю разнастайнасць тэатральнага жыцця — ад буйных праблем да прыватных арганізацыйных пытанняў.

ПЕРШЫЯ АКОРДЫ. Фота В. СТАРЧАНКАВА.

ТВАРЫЦЬ ДЛЯ НАРОДА, У ІМЯ КАМУНІЗМА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й і 2-й стар.).

Аб неабходнасці пошукаў гаварылі А. Гугель і І. Ахрэмчык. Мастак павінен заўсёды шукаць. Аднак пошукі — гэта не фокуснічанне. Нельга мірыцца, калі на палотнах з'яўляюцца людзі недарэчнымі, без думкі і інтэлекту, нават з абрубленымі тварамі і абрэзанымі чарапамі, што мы нярэдка бачым у заходніх мастакоў.

А. Гугель падкрэсліў, што ў апошні час наогул пачалі блытаць станковы жывапіс з дэкаратыўным, з плакатам на палатне. Больш таго, можна пачуць галасы — маўляў, далоў станковы жывапіс. Гэта не што іншае, як дэмагогія. Калі ўжо гаварыць аб сапраўдным наватарстве, дык пад ім трэба разумець новы змест, перадачу новых думак і пачуццяў. На гэта павінны арыентавацца і старэйшыя і маладыя мастакі. Новы змест народзіць і новую форму. Аднак абнаўленне формы — працэс складаны і працяглы. І наіўнымі выглядаюць спробы «чыстага» наватарства, калі мастак імкнецца галоўным чынам здзівіць гледача. Гэта робіцца часцей за ўсё ад жадання быць модным.

На праблеме наватарства спыніўся скульптар З. Азгур. Ён гаварыў таксама аб арганізацыйных пытаннях работы саюза, аб тым, што праўленне і секцыі павінны глыбей цікавіцца творчасцю мастакоў, дапамагаць ім у вырашэнні творчых задум.

Новая форма нараджаецца толькі шляхам глыбокага вывучэння жыцця, — гаворыць І. Ахрэмчык. — Форма — не штосьці другараднае, гэта ў пэўнай меры светапогляд мастака.

Кажуць, што патрэбны мастакі розныя, розных стыляў і почыркаў. Аднак розныя стылі нараджаюцца на той жыццёвай аснове, на якой развіваецца сам мастак. Сапраўдны поспех чакае мастака толькі там, дзе ён ідзе ад жыцця, а не ад формы, не ад стылю.

— Я не магу не пагадзіцца з крытыкай маіх работ старэйшымі таварышамі, — сказаў Ул. Стальмашонак. — Я разумею, што многага яшчэ не дасягнуў. Разам з тым я не магу пагадзіцца, калі замест таго, каб шукаць, узбагачаць сябе, як мастака, на шляху гэтых пошукаў мне прапануюць ісці след у след за старэйшымі, па пратаптаных імі сцежках. У мастацтве няма пратаптаных сцежак. І да якіх бы здабыткаў ні прыйшоў мастак, ён павінен прыйсці сваім шляхам.

Далей Ул. Стальмашонак гаворыць аб тым, што ў саюзе кепска наладжана работа з маладымі мастакамі. Маладзёжная камісія, якая была створана некалькі гадоў назад па прыкладу іншых рэспублік, па сутнасці, ліквідавана, нічога не робяць у гэтым кірунку праўленне Саюза мастакоў і секцыі.

У Беларусі ёсць Тэатральна-мастацкі інстытут, які рыхтуе жывапісцаў, скульптараў, графікаў, дэкаратараў. Здавалася б, што справа падрыхтоўкі маладых кадраў у нас можа і павінна быць на ўзроўні. На жаль, у рабоце інстытута ёсць недахопы, якія сур'ёзна тармозяць справу. Аб гэтым гаварылі старэйшы мастак сцэны А. Марыкс, а таксама П. Дурчын, М. Данцыг і іншыя.

Цікавую гаворку аб узаемаадносінах паміж рознымі галінамі мастацтва і архітэктурай павяла на з'ездзе старшыня Саюза архітэктараў БССР В. Ладыгіна. Амаль ва ўсе перыяды гісторыі, сказала яна, архітэктура і выяўленчае мастацтва не былі абыякавыя адзін да аднаго, аказвалі ўзаемны ўплыў у стварэнні форм і стылю. Творчыя метады і новыя мастацкія прыёмы архітэктуры і зараз аказваюць непасрэдны ўплыў на выяўленчае мастацтва. Гэтага патрабуе само жыццё.

Архітэктура за апошнія гады пайшла значна ўперад, пачала выпрацоўваць новы архітэктурны стыль. І мастакам і скульптарам пара выходзіць з вузкіх рамак застарэлых паняццяў і догмаў. Перад імі стаяць вялікія задачы паляпшэння архітэктурна-мастацкага аблічча нашых гарадоў і сёл. Вялікую ролю тут павінны адыграць як дэкаратыўна-прыкладное, так і манументальнае мастацтва. Партыя гаворыць, што мастацтва павінна непасрэдна ўвайсці ў жыццё, упрыгожыць быт, адухатварыць працу чалавека, павінна выхоўваць у яго густ і эстэтычныя пачуцці, зрабіць яго высакародным.

Добраўпарадкаванне гарадоў, афармленне магістралей, уездаў у гарады, інтэр'ераў жылых і грамадскіх будынкаў, кінатэатраў, дзіцячых садоў, школ — усюды патрэбна вока мастака. Усё гэта ставіць перад намі задачы стварэння новых выяўленчых прыёмаў афармлення. На жаль, гэтыя пытанні не знайшлі адлюстравання ў дакладзе праўлення саюза. Давядзецца прыкласці яшчэ нямала намаганняў, каб адстаяць прызнанне манументальнай скульптуры і жывапісу ў якасці неаддзельнай часткі архітэктурных збудаванняў. І разам з тым, трэба развіваць у мастакоў уменне ўключаць у сучасную архітэктуру творы жывапісу і скульптуры — фрэсак, рэльефаў, мазаік і г. д.

Прымяненне дасягненняў будаўнічай тэхнікі стварае ўмовы, аднак не гарантуе прагрэсіўнасці архітэктурнага збудавання. Пакуль што яшчэ не знойдзены прыёмы кампазіцыі і знешняга афармлення буйнапанельных жылых будынкаў, якія б задавальнялі эстэтычныя запатрабаванні. Прымяненне каўровай, керамічнай пліткі ў якасці аблiцовачнага матэрыялу не заўсёды апраўдана. Патрэбна шукаць больш простыя, танныя і разам з тым больш выразныя сродкі — прымяненне колеру і манументальнага жывапісу, якія б маглі выступаць у сінтэзе з любой канструкцыяй. Гэтую задачу неабходна вырашаць сумесна архітэктарам і мастакам, але для гэтага неабходна пераадолець застарэлыя погляды. Для гэтага неабходна пранікнуцца духам сучаснасці і, ва ўсякім разе, не ставіць рагатак на шляху пошукаў новых форм.

У стварэнні новага аблічча нашых гарадоў мы павінны зыходзіць з новых адносін да арганізуемай прасторы, якія маюць месца ў сучасных прынцыпах горадабудаўніцтва, і перш за ўсё ў ідэі мікрараёнаў. Ва ўсім гэтым закладзены вялізарныя, яшчэ не выкарыстаныя магчымасці архітэктурна-мастацкага ўздзеяння на савецкага чалавека.

Многім вялікім сучасным тэмам у мастацтве часам становіцца цесна ў вузкіх рамках станковага жывапісу і станковай скульптуры, працягвае размову, пачатую В. Ладыгінай, скульптар А. Анікейчык. Гэтыя тэмы просяцца на фасады дамоў, на светлыя прасторы сучасных інтэр'ераў. Яны павінны быць на плошчах і праспектах, парках і бульварах, быць у народзе, каб сродкамі манументальнай прапаганды, аб якой гаварыў Ул. І. Ленін, несці ў масы ідэі партыі.

Што ні кажы, заўважае прамоўца, а музеі, дзе ў асноўным сустракаецца мастак з гледачом, наведвае абмежаванае кола людзей. Манументальнае ж мастацтва жыве ў народзе пастаянна. Вялікія задачы і магчымасці гэтага мастацтва! На жаль, у нашай рэспубліцы яму ўдзяляецца надзвычай мала ўвагі. У Мастацкім фондзе склалася недарэчнае становішча. Так, напрыклад, размеркаванне заказаў на помнікі сярод скульптараў адбываецца згодна «жывой чаргі», без уліку творчых магчымасцей і імкненняў аўтараў. У выніку на свет паяўляюцца помнікавыя скульптуры, якія выкананы без натхнення і майстэрства.

Кожны помнік, падкрэслівае прамоўца, павінен папярэдне абмяркоўвацца шырокай грамадскасцю. Мадэлі помніка трэба паказваць на выстаўках, выстаўляць на спецыяльных глядзельных пляцоўках перш, чым прымаць іх. Яны каштуюць вельмі дорага і ў выпадку няўдачы іх не схаваеш у музейны запаснік.

Вялікай трывогай за становішча дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва прагучала выступленне госця з Эстоніі тав. Э. Эймана. Прыкладное мастацтва, як вобразна сказаў наш госць, у руках таленавітага мастака — чароўная палачка, якая стварае прыгажосць і ўтульнасць усюды, дзе жыве і працуе чалавек. Высокі ўзровень прыкладнога мастацтва, яго ўсебаковае выкарыстанне — адзнака культурнага ўзроўню жыцця народа, яго густаў і эстэтычных запатрабаванняў.

Новаму праўленню Саюза мастакоў і кіраўніцтву Мастацкага фонду, а таксама Міністэрству культуры, сказаў мастак П. Крохалеў, неабходна дабіцца ўсебаковага развіцця усіх відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якое так любіць і ў якім мае вялікую патрэбу наш народ.

Значная роля ў развіцці мастацтва належыць мастацтвазнаўчай крытыцы.

Яе задача — кваліфікавана аналізаваць з'явы мастацкага жыцця. Але ў нашым друку часта з'яўляюцца некваліфікаваныя, неаб'ектыўныя, або проста інфармацыйныя артыкулы, гаворыць М. Роберман. Яны не даюць ніякай карысці ні мастакам, ні чытачам.

Працягваючы гэтую размову, мастак Я. Ціхановіч спыняецца на рабоце крытычнай секцыі Саюза мастакоў. Члены секцыі вельмі рэдка выступаюць на абмеркаваннях выставак, на разглядах асобных работ мастакоў, яны рэдкія госці ў творчых майстэрнях. Рэдка выступаюць яны і ў друку. Гэтая абыякавасць і заспакоенасць членаў крытычнай секцыі выклікае трывогу ўсіх мастакоў. Аднак праўленне саюза ні разу не разглядала пытанне аб стане крытыкі выяўленчага мастацтва ў рэспубліцы.

Адзіным суддзёй творчасці мастакоў у нас да сённяшняга дня застаецца выставачны камітэт Міністэрства культуры. Але гэты важны орган не можа і не абавязаны займацца дэталёвай і ўважлівай ацэнкай творчасці асобных мастакоў. Такім органам мог бы быць мастацкі савет. Даўно наспела необходнасць аднавіць яго работу. Тады знікнуць паспешлівыя рашэнні, будзе менш памылак у рабоце выстаўкома, бо мастацкі савет здолее займацца папярэднім зацвярджэннем эскізаў і рэкамендацыяй іх выставачнаму камітэту для заключэння дагавораў.

Аб выстаўкоме як органе, які адказны за папулярызацыю ўсяго лепшага ў беларускім выяўленчым мастацтве, гаварылі многія прамоўцы. Задача выстаўкома, сказаў мастак М. Бельскі, рабіць правільны і аб'ектыўны адбор мастацкіх твораў, не дапускаючы да экспазіцый шэрых і незавершаных палотнаў, скульптур, графічных лістоў. Вышэйшым прынцыпам яго дзейнасці павінны быць аб'ектыўнасць, узаемная павага, давер'е да таварышаў па мастацтву. Ці заўсёды праяўляюцца гэтыя якасці ў членаў нашага выстаўкома? Далёка не заўсёды.

Рэспубліканскаму выставачнаму камітэту трэба дэмакратызаваць сваю дзейнасць — аб гэтым гаварылі многія прамоўцы. Апрача выканання сваёй функцыі — заключаць дагаворы з мастакамі — выстаўком павінен накіроўваць творчае жыццё.

Нам патрэбны добрыя і розныя творы, нам трэба, каб развіваліся і раслі таленты з рознымі індывідуальнасцямі і почыркамі. І чым больш разнастайнымі, своеасаблівымі будуць яны, тым больш багатым будзе выяўленчае мастацтва рэспублікі. На жаль, нярэдка бывае так, што члены выстаўкома імкнуцца да ніверыроўкі талентаў. Гэтую думку выказаў у сваім выступленні мастак М. Данцыг. Яго падтрымалі іншыя мастакі. Яны прыгадвалі выпадкі, калі выстаўком садзейнічаў паяўленню на выстаўках шэрых, аднастайных работ.

Гаворачы аб неабходнасці дэмакратызаваць дзейнасць выстаўкома, прамоўцы неаднаразова падкрэслівалі той факт, што выстаўком на працягу шмат гадоў не мяняе свайго складу. Праходзяць гады, растуць новыя мастакі, яны ўдзельнічаюць на выстаўках з новымі творамі, а склад выстаўкома застаецца ранейшым, і густы ў яго застаюцца ранейшымі, якія не заўсёды адпавядаюць узросшым задачам развіцця нашага выяўленчага мастацтва.

Галоўная бяда выставачнага камітэта якраз у тым, што ён працуе ў адрыве ад творчых арганізацый саюза. Работы, якія прадстаўляюцца камітэту, не абмяркоўваюцца папярэдне на секцыях. А іменна секцыя і павінна быць першай інстанцыяй, дзе з мастаком вядзецца творчая, прафесіянальная размова. Неабходна, каб секцыі не толькі абмяркоўвалі, але і рэкамендавалі і нават абаранялі лепшыя работы на выстаўкоме. Гэта павысіць прынцыповасць, павысіць творчы ўзровень работы камітэта ў цэлым, ліквідуе магчымасць індывідуальнага, неаб'ектыўнага падыходу да творчасці тых ці іншых мастакоў.

Гаворка на з'ездзе вылілася ў прынцыповую размову аб далейшых шляхах развіцця беларускага выяўленчага мастацтва, аб неабходнасці глыбейшага вывучэння жыцця, неабходнасці працаваць па-новаму, быць на ўзроўні задач, якія стаяць зараз перад савецкім народам.

Т. Разіна.

Л. Ран.

Г. Азгур.

А. Бархаткоў.

Мал. М. ЖЫТНІЦКАГА.

ЗВАНІЦЕ па тэлефоне 1-25...

Чалавеку гаворацъ ДЗЯКУЙ

Ад самых дзвярэй Анатоль урачыста крыкнуў:

— Перам агі!..

Алежка — чатырохгадовы хлапчук — кінуўся насустрач бацьку:

— Ура!..

Але Ніна не падзяліла мужавай радасці. З дакорам паказала яна на гадзіннік і выйшла на кухню.

Добры настрой Анатоля як рукой зняло. На сэрцы закіпела крыўда на жонку. І кожны раз так: варта яму затрымацца дзенебудзь — хоць бы, як сёння, на валейбольных спаборніцтвах — і дадому хоць не прыходзь. А чаму? Няўжо ён дзед які-небудзь, каб адно толькі і ведаць — дома сядзець. Як добра было раней, калі ўсюды хадзілі яны разам з Нінай. Цяпер так не выпадае — няма на каго пакінуць Алежку. Дык што ж — зрабіцца праз гэта дамаседам, адарвацца ад таварышаў?..

Але адразу ж падумалася іншае: дык жа і Ніна таму крыўдуе, што не можа, не мае магчымасці выйсці з дому. А ёй таксама хочацца і на рэпетыцыю ў клуб, і на валейбольную трэніроўку... Вось становішча — і выйсця не знойдзеш!..

Пра сваю бяду Анатоль расказаў неяк у камітэце камсамола. І як жа быў ён здзіўлены, калі наступным вечарам да іх дамоў прыйшла кантралёр АТК Раіса Фралова.

— Мяне прыслаў «штаб добрых спраў», — сказала яна.

— Хто? — здзівіўся Анатоль.

— «Штаб добрых спраў». Гэта мы ў камсамольскай арганізацыі аддзела тэхнічнага кантролю стварылі.

— Не разумею.

— Вы ўчора скардзіліся, што няма на каго сына пакінуць, калі хочаце куды схадзіць з жонкай... Вось я і прыйшла...

— Шчырае дзякуй табе, Раіса, — сумеўся Анатоль. — Але сёння мы, відаць, ужо нікуды не пойдзем. А ў другі раз абавязкова да вас звернемся. Шчырае дзякуй.

Назаўтра ўвесь завод абляцела вестка, што камсамолкі аддзела тэхнічнага кантролю стварылі «штаб добрых спраў». Тэлефон 1-25, па якому звоняць у штаб, хутка стаў адным з самых папулярных на заводзе. У штаб прыходзяць і звоняць маладыя маці, бацькі, усе, каму патрэбна дапамога і падтрымка. І дзяўчаты з АТК ахвотна адгукаюцца на іх просьбы.

— Спачатку некаторыя пярэчылі, — успамінае камсорг АТК Марыя Салавей. — Што мы, нянькі, — казалі. — Самім пагуляць хочацца. Ды і вучацца многія... Але потым задуманая справа прыйшлася да душы многім.

— Усе мы вучымся. Усе даражым сваім часам, — расказваюць і іншыя дзяўчаты. — Але разумеем, што робім патрэбную, высакародную справу. А інакш жыць цяпер нельга.

Нядаўна ў заводскай шматтыражнай газеце было апублікавана пісьмо майстра экіпажнага цэха Мікалая Талькевіча. Яно называлася «Вялікае дзякуй».

«Калі ў мяне пачалася экзаменацыйная сесія, жонка працавала ў першай змене, і не было на каго пакінуць дачку, — піша М. Талькевіч. — На дапамогу прыйшлі камсамолкі з «штаба добрых спраў». Яны заставаліся з дзіцем, вельмі, вельмі памаглі мне і маёй сям'і. Можна сказаць, што дзякуючы ім, і ў першую чаргу Раі Фраловай, я паспяхова здаў усе экзамены. Ад шчырага сэрца дзякую Раі і яе сяброўкам за іх добрыя, патрэбныя справы».

Такія пісьмы часта прыходзяць у камітэт камсамола завода. Як тут не паціснуць моцна рукі дзяўчатам са «штаба добрых спраў!».

Я. МАЗО.

Мінск. Мотавелазавод.

У ТВОРЧУЮ КАМАНДЗІРОЎКУ

Гэтая падкова — Не выпадкова.

Мал. А. ВОЛКАВА.

СЛЁЗЫ МАЦІ

Жыве ў вёсцы Парэчча старая жанчына. Хутка год, як жыве. А ад сыноў — ніякай весткі. Прывезлі, кінулі — і забыліся... І толькі думы, горкія думы і нямое пытанне:

— За што, сыночкі, родныя мае? За што?

Выйдзе старая з дому, дабярэцца як-небудзь да аколіцы, сядзе пад бярозай і глядзіць, глядзіць удалячынь, у бок горада. Усё некага чакае. Сусядзі пашэпчуцца, паспачуваюць, і раптам прарвецца абурэнне, хтосьці звоніць у Талачын, патрабуе Івана Макарэвіча, бухгалтара міжкалгаснай будаўнічай арганізацыі. Саромяць — сын жа! Спрабавалі адшукаць Мікалая, які недзе ў Мінску,— і яму ж яна маці! Але нічога не выйшла.

І зноў слёзы засцілаюць старэчыя вочы. Дзеці, сыны! Усё жыццё яна аддала ім.

Шасцёх гадавала Алена Гарасімаўна Макарэвіч. Гадавала адна. Карней Макарэвіч — моцны серадняк — узяў за жонку першую прыгажуню на сяле тоненькую Ленку наперакор волі бацькоў (нягожа, маўляў, радніцца з галечай), наперакор жаданню самой Ленкі — проста захацеў і ўзяў. А яе бацькі пакваліліся на «багацце». А потым — ганарлівы, распешчаны, аматар выпіць і павалачыцца — гэтак жа захацеў і кінуў. Кінуў з шасцю сынамі на руках. Цяжка было. Памёр малодшы. Але пяцёх выгадавала, выпесціла маці. Паставіла на ногі. Дачакалася і нявестак і ўнукаў. Сыны працавалі, у дом прыйшоў дастатак. А потым — вайна. Яна прынесла ў хату тры пахавальныя. Засталіся двое — Іван ды Мікалай. З'явіліся неяк у глухую ноч, калі фронт быў ужо далёка на ўсходзе.

— Мы ў палоне былі, але ўцяклі, — растлумачылі коратка.

Узрадавалася — як ні кажы, сыны вярнуліся. Але адразу ж спахапілася і засаромелася. Як жа так? Людзі змагаюцца, кроў праліваюць... А яны прыйшлі дадому. Прабавала гаварыць, намякаць, што можна б у партызаны пайсці.

Сыны хмурыліся, маўчалі. Ды нарэшце кінуў адзін злосна:

— Сама ідзі ў гэтае пекла, мы абыдземся.

І абышліся.

Скончылася вайна. Мікалай падаўся ў горад, вучыўся, працаваў, зноў вучыўся. І пісаў маці пісьмы. Гэта таксама была матчына радасць. І хоць даўно, з таго часу, як прыдбаў сям'ю і дастатак яе гарадскі сын, Алена Гарасімаўна не мае вестачкі ад яго, усё ўспамінае яна гэтыя пісьмы, і стары твар яе асвятляе ўсмешка. Выйшаў Мікалай у людзі.

Маці жыла пры Іване. Так, не з Іванам, а пры Іване. Некім накшталт служанкі. Спачатку, пакуль мела сілы, усё ішло добра — няньчыла ўнука, вяла гаспадарку. А яна пашыралася. Паставіў Іван новы дом, завёў жывёлу. Сам працаваў брыгадзірам у калгасе. Неўзабаве яго паслалі вучыцца на бухгалтарскія курсы ў горад. Пакаштаваў ён, як кажуць, гарадскога жыцця і кінуў калгас. Перасяліўся ў Талачын. Стаў галоўным бухгалтарам міжкалгаснай будаўнічай арганізацыі. А неўзабаве перавёз дом, пашырыў яго. Адно, чаго не хапіла ў ім, дык гэта месца для маці. То не там села, то не так прайшла, не тое сказала, не ў тую руку хлеб узяла. Словам, пасыпаліся дакоры, папрокі, пагрозы. Пачалі выжываць маці.

Не вытрымала Алена Гарасімаўна, занядужала. Паўгода праляжала ў бальніцы. Паўгода не бачыла сына. Не, не перадачы чакала яна ад сына, проста паглядзець хацела на яго. Але дзе там!

Прыйшоў Іван толькі тады, калі Алене Гарасімаўне трэба было выпісвацца. Кінуў:

— Збірайся, паедзем.

— Куды?

— Не на курорт жа, у вёску.

І, не заязджаючы дамоў, павёз маці за сем кіламетраў у вёску Парэчча, да сваёй цешчы.

І жыве ў Парэччы маці. Старая, хворая. Жыве як нахлебніца. Нальюць ёй крупніку, а ў яе лыжка дрыжыць у руках.

— Старая, не скуголь!

— Старая, вады!

Гэта крычыць унук гаспадыні дома — школьнік Вілік Календа.

І цягнецца, ледзь пераступаючы, Алена Гарасімаўна па ваду, баючыся не паслухацца маладога здаровага хама. Пройдзе некалькі крокаў, адпачне трошкі і далей.

А недалёка, за сем кіламетраў, жыве выгадаваны ёю сын. Таксама здаровы і сыты, жыве ў дастатку. Іван нават матчыну пенсію за загінуўшых сыноў атрымлівае — 16 рублёў 50 капеек. І прысвойвае...

А Мікалай? Дзе ён?

Алена Гарасімаўна не скардзіцца, толькі плача. Цяжка выпытаць у яе што-небудзь пра сыноў. Мы толькі пацікавіліся, ці няма ў яе адраса Мікалая.

— Не, саколікі, не піша. Можа, і няма яго ўжо жывога.

Жывы Мікалай Макарэвіч. Жывы і дужы. У нас у руках квітанцыя за № 08681 Мінскай даведачнай інфармацыйнай канторы. У ёй адрас: Мінск, 2-я Арктычная, дом № 75, кватэра 2.

Пастукалі ў дзверы. На парозе самазадаволены поўны мужчына.

— Так, працую майстрам на заводзе пластмасавых вырабаў. Як жыву? Нішто сабе.

Чаго мы прыйшлі, ён яшчэ не ведае. І, як гасцінны гаспадар, з гонарам паказвае кватэру, паліраваныя шафы, тэлевізар, паліцы з кнігамі, карціны на сценах...

— Не цесна вам? — цікавімся мы.

— Што вы! — смяецца гаспадар. — Нас усяго трое. Старэйшы сын у арміі. Вось кватарантку нават трымаю.

— Як зарабляеце?

— Паскардзіцца не магу.

— Даруйце, а маці ў вас ёсць?

Ні ценю збянтэжанасці. Нават жартуе: «Не квактуха ж мяне вывела». І спакойна расказвае. Яна, маўляў, жыве ў брата ў Талачыне. Як у хрыста за пазухай. Ці памагаю я ёй? Ды ёй нічога не трэба, у яе ўсяго хапае. Пісьмы? Навошта, яна ж — непісьменная.

— А колькі гадоў вашай маці?

Сумеўся. Не памятае.

— Ну, хоць на дзень нараджэння, на якое свята ці пасылалі вы ёй падарункі?

І зноў моршчыць лоб, успамінае. Прыходзіць на дапамогу жонка — неяк гадоў два назад боты гумавыя паслалі. У Мінску яны не патрэбны. Усюды ж асфальт.

— А ёй навошта гумавыя?

— Дзіўна. Што ж, выкідаць іх?

Вось і ўся гісторыя. Страшэнная, дзікая.

Проста знаёмым жанчынам, нашым харошым, добрым жанчынам падносім мы падарункі ў дзень нараджэння, віншуем з 8 Сакавіка. Магчыма, гэта робяць і Макарэвічы — Іван і Мікалай? Магчыма.

Чакае старая, хворая жанчына, маці, гатовая забыць усе крыўды, добрага слова, ласкі ад сваіх сыноў. Чакае. А ёй — гумавыя боты, якія нельга прадаць на рынку і шкада выкінуць.

Мы звяртаемся да работнікаў Талачынскай міжкалгаснай будаўнічай арганізацыі і Мінскага завода пластмасавых вырабаў: хто працуе побач з вамі, хто падае вам кожны дзень руку для поціску? Ці варты яны быць вашымі сябрамі, вашымі кіраўнікамі?

І яшчэ мы звяртаемся да судовых органаў. У нас ёсць справядлівыя законы, якія ўжываюцца ў такіх выпадках.

Станіслаў ШУМСКІ,
Пётр ШАЎЦОЎ,
слухачы Мінскай вышэйшай партыйнай школы.

Прыгожым становіцца Гомель. З кожным годам расце дабрабыт працоўных. На гэтым здымку вы бачыце жылыя дамы па вуліцы Працоўнай.
Фота Ул Крука.

Падзеі Факты Навіны

△ У сувязі з Днём Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту на гарадскіх і сельскіх кінаўстаноўках рэспублікі праводзіцца шырокі паказ кінафільмаў, прысвечаных баявым подзвігам і мірным будням нашых воінаў. Дэманструюцца лепшыя творы савецкай кінематаграфіі, створаныя ў даваенныя і пасляваенныя гады.

Аб героях Брэсцкай крэпасці расказвае фільм «Бессмяротны гарнізон». Стойкасці і гераізму савецкай моладзі прысвечаны кінакарціны «У шэсць гадзін вечара пасля вайны», «Маладая гвардыя», «На шляхах вайны» і многія іншыя.

З цікавасцю прагледзяць гледачы таксама кінафільмы «Чыстае неба», «Мір уваходзячаму», «Машанька», «Два байцы», «Чапаеў», «Ляцяць жураўлі», «Адмірал Нахімаў», «У мірныя дні», беларускую кінакарціну «Чалавек не здаецца» і інш.

Баявым дзеянням каманды бронепоезда-56, якая здолела ў дні Вялікай Айчыннай вайны ў адным баі знішчыць 136 нямецкіх танкаў і дала магчымасць часцям Савецкай Арміі выйсці з акружэння, прысвечана мастацкая кінаапавесць «Крэпасць на колах».

△ У спектаклях Беларускага дзяржаўнага ордэна Леніна Вялікага тэатра оперы і балета прынялі ўдзел артысты оперных тэатраў Ленінграда і Пермі.

Партыю графа Альмавівы ў оперы Дж. Расіні «Севільскі цырульнік» выканаў саліст Ленінградскага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета імя С. М. Кірава А. Манухаў.

Саліст Пермскага опернага тэатра А. Сыраватка выканаў партыю Хазэ ў оперы Ж. Бізэ «Кармэн» і партыю Радамэса ў оперы Дж. Вердзі «Аіда».

△ Нядаўна калектыў Мяжанскага сельскага клуба Браслаўскага раёна даў канцэрт для жыхароў пасёлка Сілене Даўгаўпілскага раёна Латвійскай ССР. У праграме канцэрта была п'еса «Мікітаў Лапаць» М. Чарота, а таксама беларускія народныя і сучасныя песні.

На радзіме Шахразады

К. БУРМІСТРАЎ

СЯБРЫ

Калі паедзеце на поўдзень ад Багдада па шырокай асфальтавай шашы, дык на 160-м кіламетры трапіце ў невялікі горад Куфа, дзе жыве менш 15 тысяч чалавек. Сюды мяне спачатку і накіравалі працаваць. Пасялілі ў катэджы за горадам. Вакол раскінулася бясконцая пустыня, з якой начамі даносілася выццё шакалаў.

Па сведчанню мясцовых жыхароў, тут бывае цудоўнае надвор'е ў зімовы перыяд, калі па тры-чатыры разы ў месяц праходзяць дажджы і ажывае прырода. Вакол усё цвіце. Пальмы і эўкаліпты ачышчаюцца ад пылу і робяцца ярка-зялёнымі. Тэмпература паветра дасягае днём 15-20 градусаў цяпла, а ўначы апускаецца не ніжэй нуля.

Але я трапіў у Куфу летам, калі было горача і суха. Тэмпература ў ценю — 40-50 градусаў. Дажджоў і паміну няма. Нярэдка вецер наносіць з пустыні драбнейшы пыл. У такія моманты нічога нельга ўбачыць на адлегласці 30 метраў. Многа непрыемнасцей прыносяць шкодныя насякомыя: скарпіёны, фалангі і інш. На кожным кроку сустракаюцца змеі.

Калі я ўпершыню ўбачыў на двары скарпіёна, дык адчуў сябе даволі няёмка ад такога суседства. Потым мы ўсе звыкліся і спакойна іх знішчалі. Быў выпадак, калі да нас у ванную запаўзла змяя, залезла па трубе.

На работу нас вазілі ў санітарнай машыне. Спачатку працаваць было вельмі цяжка. Галоўная бяда — няведанне мовы пацыентаў. Ні распытаць, ні параіць нічога не маглі. На ўсю нашу групу, якая складалася з трох урачоў, была толькі адна перакладчыца. Тады мы старанна ўзяліся за ўдасканаленне сваіх ведаў у англійскай мове, якую калісьці вывучалі, але, на жаль, не вельмі сур'ёзна. Адначасова вучыліся гаварыць па арабску. Праз тры месяцы ўжо маглі весці нескладаныя гутаркі з мясцовымі жыхарамі.

Але і ў першыя дні мы атрымалі адчувальную падмогу ад арабскіх сяброў. Нам давялося працаваць поплеч з хірургамі Ахмедам і Брагімам. Гэта аказаліся выдатныя, прагрэсіўныя людзі. Ахмед — ужо немалады паўнаваты мужчына сярэдняга росту, з пранікліывымі чорнымі вачыма і добрай шчырай усмешкай. Брагім — сімпатычны малады чалавек, які зусім нядаўна атрымаў дыплом урача, але ўжо карыстаецца славай добрага, сумленнага спецыяліста. Абодва так сардэчна, так шчыра адносіліся да нас, што ўжо на другі дзень здавалася, нібыта мы знаёмы многія гады. Яны з першых дзён добраахвотна ўзялі на сябе функцыі нашых перакладчыкаў. Калі ў іх канчаўся рабочы дзень, яны прыходзілі да нас, і мы разам прымалі хворых. Тлумачэнні пацыентаў яны перакладалі на лацінскую мову, якая добра вядома кожнаму ўрачу. А мы такім жа шляхам перадавалі хворым свае вывады і парады.

Працаваць нам давялося ў даволі складаных умовах. Мясцовае насельніцтва не прывыкла лічыцца з патрабаваннямі санітарыі і гігіены.

Неяк абходзіў я шпіталь (так называюць у Іраку бальніцы) у начны час. Мяне ахапіў жах. Гэта, напэўна, здарылася б з любым нашым урачом, калі б ён быў на маім месцы. Многіх хворых не аказалася ў палатах. Адны пайшлі начаваць дадому, другія — маліцца ў мячэць, якая знаходзілася на адлегласці звыш трох кіламетраў. А тыя, што засталіся, спалі не на ложках, а на падлозе разам са сваякамі, якія прыйшлі іх адведаць. Раніцай наведвальнікі прама ў палатах грэлі самавары і пілі чай.

З-за розных забабонаў і нам прыйшлося мірыцца з многімі парушэннямі медыцынскіх правіл. Хворых кладуць у шпіталь у сваёй бялізне, бо ў арабаў лічыцца, што калі апранеш бальнічную бялізну, дык абавязкова загінеш. Ніяк не згаджаюцца яны і мыцца. Многія прывозяць з сабой зямлю і мажуць ёю сцены палаты. Цяжка было нам звыкнуцца з тым, што памяшканні прыбіраюцца сухім спосабам і ў момант уборкі там няма чым дыхаць з-за густога пылу.

Сутыкнуліся мы і з занядбанасцю раду галін медыцыны. Асабліва адстае стаматалогія. Дагэтуль у краіне ведаюць адзін спосаб лячэння зубоў — вырыванне іх. Дрэнна пастаўлена паталага-анатамічная служба. Трупы загінуўшых ускрываюцца толькі па распараджэнню паліцыі. Гэта звязана з тым, што мусульмане імкнуцца хутчэй пахаваць нябожчыка, «пакуль не аддзялілася душа ад цела».

Аднак да нас, медыкаў, пацыенты адносіліся з вялікай павагай, і нам паступова ўдалося прывучыць іх да строгіх шпітальных парадкаў.

Шпіталь у Куфе размешчаны на беразе славутай ракі Еўфрат. Калі я ўпершыню ўзышоў на яе пясчаны бераг і зазірнуў у водную глыбіню, то быў здзіўлены незвычайным мноствам рыбы, якая так і кішэла зверху да самага дна. Аказваецца, яе ловяць вельмі мала. За ўвесь час мне нават не давялося бачыць чалавека з вудай. Сам я заўзяты аматар такога спосабу рыбалоўства і, натуральна, не мог прымірыцца з яго поўным ігнараваннем. Рашыў прывучыць да рыбнай лоўлі арабскіх сяброў. Спроба ўдалася вельмі добра. Нашы хірургі Ахмед, Брагім і іншыя ўрачы ахвотна пачалі ездзіць з намі на Еўфрат і навучыліся даволі спрытна лавіць вудамі рыбу. Адзначу, між іншым, што больш за ўсё лавіліся невялікія пражэрлівыя самы.

Дарэчы, іракцы вельмі старанна ахоўваюць свае рыбныя багацці. Рыбу ловяць толькі сецямі з буйнымі ячэйкамі, каб не трапляла ў іх драбяза.

Увосень мяне па загаду міністра аховы здароўя Іракскай рэспублікі перавялі на работу ў багдадскі шпіталь. Тут мне давялося больш падрабязна пазнаёміцца са станам аховы здароўя насельніцтва. Як я ўжо адзначыў, манархічны рэжым пакінуў вельмі цяжкую спадчыну. Да рэвалюцыі ў краіне штогод рэгістравалася 4,5 мільёна хворых — тры чвэрці насельніцтва. Медыцынская дапамога была платнай і таму недаступнай для беднякоў.

У дзяржаўных шпіталях лячэнне цяпер бясплатнае. Але за знаходжанне ў палатах 1 і 2 класаў хворыя павінны плаціць 1-2 дзінары за дзень. У гэтых палатах прыходзіцца таксама плаціць за аперацыі і медыкаменты. І толькі для хворых, якія знаходзяцца ў палатах трэцяга класа, сапраўды існуе бясплатнае лячэнне.

На першы погляд здаецца, што бедныя слаі насельніцтва забяспечаны нармальнай медыцынскай дапамогай. Але гэта далёка не так. Дзяржава адпусціла на аховы здароўя ў 1959 годзе менш пяці мільёнаў дзінараў. У пераводзе на нашы грошы на жыхара прыйшлося ў год 8,6 рубля (у СССР — 200 рублёў).

Амаль усе ўрачы, якія працуюць у дзяржаўных медыцынскіх установах, маюць свае прыватныя платныя клінікі, а некаторыя нават стацыянары. Гэта іншы раз параджае нядобрасумленныя адносіны да выканання службовых абавязкаў. Некаторыя за сем гадзін прымаюць па 100—150 хворых. Дзе ўжо тут да падрабязнага вывучэння хваробы і эфектыўнай дапамогі. Яна аказваецца такімі ўрачамі толькі ва ўласнай клініцы. За аперацыю апендыцыту і аказаныя пры гэтым паслугі хворы павінен заплаціць 80—100 дзінараў, у той час, як сярэднемесячны заробак рабочага складае толькі 15-20 дзінараў, а землякопа — 6-7.

Асноўная маса ўрачоў і цяпер працуе ў вялікіх гарадах. Таму сельскае насельніцтва дагэтуль яшчэ пазбаўлена своечасовай кваліфікаванай медыцынскай дапамогі, знаходзіцца пад уладай знахароў і шаптух.

...У Багдадзе я даведаўся аб радаснай навіне: прыехала жонка. Сустрэліся, як пасля шматгадовай разлукі, хаця не бачыліся ўсяго некалькі месяцаў. Пасялілі нас у прасторным пакоі ў адным з катэджаў, дзе жывуць нашы ўрачы. У нашым распараджэнні, акрамя таго, агульны вестыбюль. Адсюль можна падняцца на дах, які ўяўляе з сябе кафельную пляцоўку, абгароджаную высокім бар'ерам. Тут вельмі зручна загараць, любавацца цудоўнымі відамі Багдада, прагульвацца і адпачываць.

Нягледзячы на пахаладанне, цвітуць ружы і алеандры, яркай зелянінай цешаць позірк пальмы. Убачылі мы тут і нашы родныя таполі, асіны і вербы. З надыходам восені, яны, як і на радзіме, скідаюць лісце.

Птушак мала. Ёсць вераб'і. Яны буйнейшыя, чым нашы, але палахлівыя і менш нахабныя. Давялося нам бачыць таксама сарок, варон і галубоў. У цёплыя ночы слухалі спевы цыкад. Яны прыемна цешаць слых і надаюць асаблівую чароўнасць гэтаму паўднёваму краю. Але з наступленнем халадоў цыкады кудысьці зніклі.

Багдад раскінуўся на 20 кіламетраў уздоўж ракі Тыгр. Арабскае імя ракі — Дачлен. Тыграм раку празвалі англічане. Сталіца на фоне вечна блакітнага неба, пад асляпляльнымі праменнямі сонца выглядае чароўна. Тут вельмі многа мячэцей, мінарэтаў, палацаў, багатых віл, магазінаў.

На новым месцы ў нас таксама адразу з'явіліся надзейныя сябры, якія імкнуліся стварыць нам усе ўмовы для плённай працы. Вось характэрны прыклад. У першыя дні ў багдадскім шпіталі мне дапамагаў медыцынскі брат Шакер. Гэта быў маленькі чалавечак з непрыемнымі лёкайскімі манерамі. Вочы яго заўсёды бегалі, нібы ён баяўся, што ў іх можна будзе прачытаць яго сакрэты. Арабскія ўрачы мне паведамілі, што гэта сапраўды падазроны чалавек. Пры манархічным рэжыме ён быў супрацоўнікам паліцыі, а пасля ўсталявання рэспублікі вырашыў дзейнічаць на медыцынскай ніве. Што і казаць, працаваць з ім мне было вельмі непрыемна. Не ведаю, якія захады прынялі нашы іракскія сябры, але праз кароткі час Шакер знік. Замест яго да мяне прыслалі медыцынскага брата Багу. Гэта быў атлетычнага складу трыццацігадовы мужчына з прыгожым смуглявым тварам, на якім чарнелі вялікія вусы. У яго добрае, чулае сэрца, зыркія вочы, умелыя рукі, як і належыць работніку медыцынскай арміі.

Калі ў апошнія гады маёй працы ў Іраку мяне накіравалі на поўнач краіны, Бага, які паспеў моцна прывязацца да мяне, папрасіў узяць яго з сабой. Маё хадайніцтва задаволілі, і мой памочнік, абмяняўшы кватэру, разам з сям'ёй перабраўся са сталіцы ў правінцыю. Пазней, калі я ад'язджаў на радзіму, мы расталіся як самыя лепшыя, самыя блізкія сябры.

Шчырая дружба ўсталявалася ў нас з многімі мясцовымі інтэлігентамі, асабліва ўрачамі. З урачом Аднанам, фармацэўтам Шамунам мы часта ездзілі лавіць рыбу на Тыгр або проста бавілі разам вольны час. Між іншым, у першыя месяцы мне давялося пазнаёміцца з даволі капрызным норавам Тыгра. У часе дажджоў рака часта выходзіць з берагоў і затапляе вялізарныя плошчы, пакідаючы на паверхні пласт урадлівага глею. Як толькі вада спадае, арабы закладваюць на вызваленых плошчах бахчы і вырошчваюць на іх разнастайную гародніну — агуркі, памідоры, гарбузы і інш. Але здараецца і так, што перыяд дажджоў надыходзіць зарана, рака нечакана разліваецца, і тады праца людзей прападае марна. Аднойчы здарыўся такі выпадак. Аднан запрасіў нас правесці выхадны дзень на маляўнічым зялёным лужку на беразе Тыгра. Паехалі туды на машынах, загадзя смакуючы цудоўны адпачынак. Але прыйшлося вярнуцца ні з чым. І намечаны лужок, і суседнія бахчы заліла вада. Гэта раптоўныя дажджы вымусілі Тыгр выйсці з берагоў.

Арабка нясе на рынак малако.

Форум пісьменнікаў двух кантынентаў

Каб быў мір на зямлі! — гэтай думкай былі прасякнуты выступленні прамоўцаў з высокай трыбуны Каірскай канферэнцыі пісьменнікаў краін Азіі і Афрыкі. На пленарных пасяджэннях канферэнцыі выступіла каля сарака дэлегатаў. Слова «мір» гучала на ўсіх мовах.

Удзельнікі канферэнцыі адзінадушна прынялі агульную Дэкларацыю, зварот да пісьменнікаў усяго свету, зварот да студэнтаў краін Азіі і Афрыкі, рэзалюцыі па асобных краінах, а таксама рашэнні па асобных арганізацыйных пытаннях.

«Сучасная абстаноўка, — гаворыцца ў Дэкларацыі, — характарызуецца ўзмацненнем барацьбы народаў Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. У некаторых выпадках гэтая барацьба знаходзіць сваё выяўленне ў форме нацыянальна-вызваленчых войнаў і рэвалюцыйных рухаў. У другіх — яна прымае формы масавых выступленняў супраць марыянетачных урадаў і ў барацьбе за эканамічныя і сацыяльныя змены. У выніку гэтай барацьбы імперыялістычная сістэма пахіснута ў самой сваёй аснове».

Удзельнікі канферэнцыі заклікалі пісьменнікаў усяго свету далучыць свой голас да пісьменнікаў краін Азіі і Афрыкі, каб выкарыстаць сваё майстэрства «ў барацьбе супраць каланіялізму ва ўсіх яго формах з мэтай дасягнення лепшага жыцця для людзей, каб забяспечыць ім хлеб, культуру і мір...»

15 лютага канферэнцыя закончыла сваю работу.

Трэцяя канферэнцыя пісьменнікаў краін Азіі і Афрыкі адбудзецца ў Інданезіі.

СТЭРЭАФАНІЧНАЯ РАДЫЁЛА

Напярэдадні адкрыцця XXII з'езда КПСС супрацоўнікі сектара прыёмнікаў Мінскага радыёзавода адпраўлялі ў Ленінград новую радыёлу. Там, у Інстытуце радыёпрыёму і акустыкі, яна павінна прайсці выпрабаванні.

— Ні пуху, ні пер'я! — жартуючы пажадалі сябры, які павёз апарат.

... Пацягнуліся дні напружанага чакання. У лабараторыях канструктарскага бюро толькі і чуваць было:

— Што з Ленінграда?..

— Вестак ад Сямёна няма?..

Хвалявалісь радыёзаводскія канструктары сапраўды недарма. Яны ўпершыню ў нашай краіне распрацавалі мадэль стэрэафанічнай радыёлы. Стэрэафанія — навіна ў радыётэхніцы. Распрацоўка такой радыёлы патрабавала ад калектыву канструктараў вялікай напружанасці, нястомных пошукаў. Праўда, мінскія радыёзаводцы ўжо мелі за плячыма багаты вопыт стварэння многіх складаных канструкцый. Усёй краіне добра вядомы радыёлы «Мінск-Р-7», «Мінск 58», «Беларусь-59», прыёмнікі першага класа «Беларусь-53», «Беларусь-57».

Але са стэрэафанічнай радыёлай калектыў сутыкнуўся ўпершыню. Ніхто з канструктараў не ведаў нават, што такое стэрэафанія, не ўяўляў сабе тыпу апарата.

І вось створаны дзве вялізныя лакіраваныя скрынкі, якія мала чым нагадваюць радыёапарат. Уключаем прайгравальнік. Чуваць шум поезда. Слых улаўлівае перамяшчэнне цягніка з аднаго боку ў другі. А вось гучыць аркестр. Распазнаём кожны інструмент паасобку і нават адчуваем, дзе знаходзіцца кожны з выканаўцаў...

У вялікіх творчых пошуках праходзіла стварэнне стэрэафанічнай радыёлы. Яна была зроблена з высокачастотнага дзесяцілямпавага ўзмацняльніка і дзвюх разносных акустычных сістэм, змяшчаваных у драўляных скрынях. Над радыёлай працавалі вялікі калектыў інжынераў, канструктараў, тэхнікаў, зборшчыкаў. Канструктар Уладзімір Іваноў распрацоўваў сілавы трансфарматар. Узмацняльнікі прамежкавай частаты канструявалі былыя настройшчыкі Сяргей Шуб і Яўхім Міхельсон. Многае было для іх незразумелым, загадкавым. І калі ўжо здавалася, што мэта дасягнута, вузел распрацаваны, падыходзіў вядучы інжынер С. Школьнік і знаходзіў недаробкі.

Многае трэба ўлічыць інжынеру пры канструяванні новай мадэлі, таму ён, звычайна — не толькі тэарэтык, але сам і слесар, і мантажнік, і зборшчык, і намотчык. Перш чым даць работу людзям, ён усё выпрабуе сам. Па першых вопытных узорах будуць збірацца апараты на канвееры.

Кожны асобны вузел даводзілася па пяць — шэсць разоў пераробліваць, зноў і зноў шукаць больш дасканалыя формы. Асабліва многа работы было ў вядучага інжынера распрацоўкі. Стварэнне стэрэафанічнай радыёлы ўзначальваў С. Школьнік, начальнік лабараторыі прыёмнікаў спецыялізаванага канструктарскага бюро.

Многа год аддаў С. Школьнік радыёсправе. Амаль усе віды апаратаў Мінскага радыёзавода прайшлі праз яго рукі. Апошнія гады ён займаецца распрацоўкай новых мадэлей. За радыёлу «Мінск-61» узнагароджаны Вялікім сярэбраным медалем Усесаюзнай выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі. А ў радыёле «Беларусь-62» С. Школьнік распрацоўваў найбольш адказныя вузлы апарата: высокачастотны блок, сістэму акустыкі, антэн і карэкціраваў канструяванне астатніх вузлоў апарата.

Не менш складанай была задача тых, хто займаўся механічнай часткай стэрэафанічнай радыёлы. Канструктар Мікалай Ганчарэнка, электрамеханік Фелікс Каплан, слесар Леанід Бацвінік і Уладзімір Грыц рабілі манет шасі, кампаноўку дэталей на ім. Так, шматлікім калектывам была распрацавана мадэль першай у краіне стэрэафанічнай радыёлы. І вось яна, ужо цалкам сабраная, стаіць у лабараторыі.

Прамавугольная скрынка з пластмасавымі ўкладкамі, металічнай інкрустацыяй, каляровай шырокай шкалой вабіць вока сваёй прыгажосцю. Уключаецца прайгравальнік і ў пакоі гучыць цудоўная музыка.

Нядаўна мадэль стэрэафанічнай радыёлы вярнулася з Ленінграда. Выпрабаванні былі нялёгкімі. Радыёлу выпрабоўвалі ў лабараторыях прыёмнікаў, прайгравальнікаў, акустыкі, надзейнасці. Праводзілі кліматычную праверку. Радыёла працавала запар дванаццаць гадзін пры тэмпературы плюс 85 градусаў. У камеры вільготнасці яна працавала 48 гадзін пры тэмпературы плюс 60 градусаў і 85 працэнтаў вільготнасці. Яе трымалі ў камеры холаду пры 40 градусах марозу. І пасля кожнага такога выпрабавання — паўторная праверка па ўсіх параметрах.

Стэрэафанічная радыёла паспяхова вытрымала экзамен. Усесаюзны навукова-даследчы інстытут радыёпрыёму і акустыкі прызнаў апарат «Беларусь-62» лепшай канструкцыяй 1961 года. Стэрэафанічнай радыёле дадзена пуцёўка ў серыйную вытворчасць.

Ю. ЭСТРЫН,
рабочы радыёзавода.

Працяг. Пачатак глядзі ў №№ 13, 14 г. г.

Мантажніцу А. Навумчык і канструктара С. Школьніка ў час зборкі аднаго з вузлоў стэрэафанічнай радыёлы сфатаграфаваў наш пазаштатны карэспандэнт Г. Навумаў.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, В. Ул. ІВАШЫН, А. Н. МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), П. Ф. ПРЫХОДЗЬКА, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), М. Г. ТКАЧОЎ, І. З. ШАРАХОЎСКІ, І. Б. ШАЦІЛА, Р. Р. ШЫРМА.

ДА ВЕДАМА ПАДПІСЧЫКАЎ!
ТЭРМІНЫ ПРЫЕМУ ПАДПІСКІ НА ДРУГІ КВАРТАЛ 1962 ГОДА НА ЦЭНТРАЛЬНЫЯ ЧАСОПІСЫ ЗАКАНЧВАЮЦЦА І САКАВІКА, А НА ЦЭНТРАЛЬНЫЯ ГАЗЕТЫ — 15 САКАВІКА.
СПЯШАЙЦЕСЯ прадоўжыць сваю падпіску
«САЮЗДРУК», Міністэрства сувязі БССР.

Праўленне Саюза пісьменнікаў БССР выказвае глыбокае спачуванне пісьменніку Палескаму Вечаславу Пятровічу з прычыны напаткаўшага яго гора — смерці маці.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск. | Адрас РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-25-25, аддзела літаратуры — 3-20-54, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, выдавецтва — 3-19-52, бухгалтэрыі — 3-11-03. | «Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у аўторак і пятніцу

АТ 00069.

Друкарня выдавецтва «Звязда».